ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., Іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаванні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -ваднку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-86
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

СЕРАДА
16 Красавіка 1930 г.
№ 89 (3597)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

ТЭМП ПАЛЯВЫХ РАБОТ У ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ

РАШУЧА ЗМАГАЦЦА З ПАРУШЭНЬНЕМ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ І ЎРАДУ ПРЫ АДВОДЗЕ ЯРАВОГА КЛІНУ ІНДЫВІДУАЛЬНІКАМ

Узмацніць пільнасьць і гатоўнасьць

Стварэньне ў Польшчы габінэту «палкоўнікаў», на чале са Славэкам, было ацэнена намі, як узмацненьне ваеннай небясьпекі, як актывізацыя падрыхтоўчай работы ў справе арганізацыі ўзброенага нападу на Савецкі Саюз. Урад «палкоўнікаў», які складаецца з найбольш агрэсыўных і ваяўнічых элемэнтаў польскага фашызму, гэты ўрад тэрору і яшчэ больш узмоцненай эксплёатацыі працоўных мас—вядзе інтэнсыўную падрыхтоўку да ваенных авантур.

На старонках савецкага друку ня раз адзначаліся канкрэтныя факты ўсё ўзрастаючай падрыхтоўкі да вайны з боку польскага імпэрыялізму. Ліхаманкавыя ўзбройваньні, вялізарнейшыя сумы з бюджэту, якія ідуць на ваенныя патрэбы, пабудова раду ваенна-прамысловых прадпрыемстваў, пастаянны рост узброеных сіл краю—усё гэта факты, якія з надзвычайнай яскравасьцю гавораць аб ваенных падрыхтоўках польскага фашызму. Намі ня раз зазначалася на актыўнасьць фашысцкае Польшчы сярод прыбальтыцкіх дзяржаў і імкненьне да стварэньня раду ваенных і палітычных саюзаў з дзяржавамі Прыбальтыкі. Паяўнасьць ваеннага саюзу паміж Румыніяй і Польшчай, пастаянныя разьезды польскіх генштабістых у Румынію і прыбальтыцкія краіны, агульныя мабілізацыйна-ваенныя пляны ні для кога зараз не зьяўляюцца сакрэтам.

Антысавецкая кампанія, якая разгарнулася за апошнія месяцы ва ўсім сьвеце, знайшла сваё найбольшае адлюстраваньне ў фашысцкай Польшчы. На старонках фашысцкай і сацыял-фашысцкай прэсы са дня ў дзень вялося і вядзецца самае разбэшчанае цкаваньне Савецкага Саюзу.

Польскі фашызм, які знаходзіцца ў ціскох надзвычай глыбокага эканамічнага крызісу, які стаіць перад тварам усё больш магутна нарастаючай хвалі рэвалюцыйнага ўздыму — шукае выхаду з таго становішча, у якім ён знаходзіцца, у ваенных авантурах, у ваенных нападах на Савецкі Саюз. Гэтыя ўнутраныя прычыны, якія выклікаюць узрост актыўнасьці ваенных падрыхтовак польскага імпэрыялізму, рост імпэрыялістычнай экспансыі Польшчы на Ўсход, знаходзяцца ў цеснай сувязі з тымі задачамі, што ўскладаюцца на фашысцкую Польшчу міжнародным імпэрыялізмам. Сусьветны капітал бачыць у Польшчы свой авангардны атрад, які можна будзе кінуць на Савецкі Саюз. Фінансавыя ўладары капіталістычнага сьвету даволі адкрыта прымаюць у рахунак у сваіх антысавецкіх плянах фашысцкую Польшчу, як тую дзяржаву, якая на першым іх загадзе павінна будзе кінуць сваё войска на Кіеў і Менск.

Ваенная небясьпека зьяўляецца зараз рэальнай больш, чым калі-б там ні было. Больш, чым калі-б там ні было, таму патрэбна наша выключная пільнасьць і гатоўнасьць.

Бясспрэчна, што на фоне нашых выкрыцьцяў ваенных махінацый польскага імпэрыялізму цікавымі зьяўляюцца апошнія выступленьні буйнейшага правадыра правай партыі польскай буржуазіі—нацыянал-дэмакратыі—Рамана Дмоўскага. Раман Дмоўскі зьяўляецца вядомым палітыкам буржуазнае Польшчы і, зразумела,—заядлым ворагам Савецкага Саюзу. Тым больш цікавымі зьяўляюцца яго заявы аб ваенных плянах цяперашніх кіраўнікоў польскае дзяржавы—пісудчыкаў, аб канкрэтных фактах падрыхтоўкі ваеннага нападу на Савецкі Саюз. Раман Дмоўскі проста заяўляе, што на парадку дня ўсяе палітыкі цяперашняга ўраду Польшчы стаіць пытаньне аб вайне з Савецкім Саюзам і выкананьне тых пляпаў антысавецкага паходу, якія распрацоўваліся на апошніх нарадах міжнародных імпэрыялістых. Наша прэса падавала з выстарыальнай паўнатою гэтыя артыкулы і выступленьні Рамана Дмоўскага, надаючы ім вялікае палітычнае значэньне.

Як-жа рэагавалі на гэтыя выступленьні аднаго з буйных буржуазных палітыкаў Польшчы ўрадавая прэса і афіцыйныя ўрадавыя колы? З самага пачатку, артыкулы Дмоўскага былі спатканы надзвычай красамоўным маўчаньнем усяе фашысцкае прэсы. Апошнімі днямі гэтая «змова маўчаньня» прарвана ў старонках урадавай прэсы, у адказ на камэнтарыі да выступленьняў Дмоўскага, якія даваліся «Правдой» і «Известиями», зьяўляюцца надзвычай надазроныя па сваёй нэрвовасьці артыкулы. Афіцыёз пілсудчыкаў «Глос Польскі» наіўна заяўляе аб тым, што быццам бы ў Польшчы ніхто і ніколі ня высоўваў «бесспосўных праектаў» аб «райне або тэрытарыяльных заваёвах на Ўсходзе». Але тут-жа, пасьля гэтай пустой і нічога ня значачай заявы, «Глос Польскі» дапускае грубыя выпады супроць Савецкага Саюзу, супроць нашай пяцігодкі. Для нас зусім відавочна, што за гэтай нэрвовасьцю польскага афіцыёзу і за яго нацыфіцкай балбатнёй укрываюцца ваенныя пляны польскага фашызму, укрываецца актыўная работа авантурысцкіх элемэнтаў у справе падрыхтоўкі антысавецкай вайны. У гэты-ж дзень, другая польская газэта — «Ільюстраваны Кур'ер Цодзенны» піша:—«Бо відома-ж, што ў Бэрліне некалькі тыдняў таму назад адбыўся сход прадстаўнікоў сусьветных магнатаў фінансавага жучы ўжо аб сходзе ў Парыжы)». Урадавая прэса, зразумела, дыпляматычна абыходзіць гэтыя факты, якія зазначаюцца самой польскай прэсай. Урадавая прэса, зразумела, дыпляматычна маўчыць аб тых канкрэтных фактах ваенных падрыхтаваньняў, якія адбываюцца ў фашысцікх колах Польшчы і якія зьвязаны з інтэнсыўнай падрыхтоўкай вайны супроць Савецкага Саюзу. Разам з тым, мы ня можам не адзначыць надзвычай падазронага падарожжа начальніка Ўсходняга аддзелу міністэрства замежных спраў Польшчы пана Голувко ў Вільню. Падарожжа гэтае тлумачыцца польскаю прэсай як падарожжа, зьвязанае з рэднымі справамі ўрэгуляваньня дарожных зносін з Літвой. Зусім відавочна, што **сапраўдныя** палітычныя мэты гэтага падарожжа далёка больш сур'ёзны і, бясспрэчна, стаяць у цеснай сувязі з усімі ваенна-палітычнымі падрыхтаваньнямі польскага ўраду.

Аб чым усе гэтыя факты, усе гэтыя выступленьні польскай урадавай прэсы гавораць? Яны гавораць аб далейшым росьце ваеннай небясьпекі, яны падкрэсьліваюць яшчэ раз рост ваенных падрыхтаваньняў у лягеры польскіх імпэрыялістых, яны паказваюць на завастрэньне і пашырэньне антысавецкага фронту капіталістычных дзяржаў. Зусім невыпадкова, як паведамляе гэта «Газэта Варшавска», некаторыя нямецкія газэты друкавалі на сваіх старонках геаграфічную мапу, на якой у напрамку Савецкага Саюзу зьмешчаны дзьве стрэлкі: адна ў бок Смаленска, а другая ў бок Адэсы, а пэт мапай наступны надпіс: «Анэксыяністычныя тэндэнцыі варшаўскіх імпэрыялістых».

Усе гэтыя ваенныя пляны польскага імпэрыялізму прыкрываюцца нацыфіцкай агітацыяй сацыял-фашыстых і беларускіх і украінскіх нацыянал-фашыстых. Гэтыя агенты польскага імпэрыялізму ня толькі выконваюць ролю нацыфіцкага прыкрыцьця ваенных плянаў перад тварам працоўных мас, ня толькі вядуць шалёную антысавецкую кампанію, але і зьяўляюцца непасрэднымі арганізатарамі і натхнічелямі рыхтуючайся контр-рэвалюцыйнай вайны супроць Савецкага Саюзу.

Працоўныя масы Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ня хочуць вайны супроць Савецкага Саюзу. Яны актыўна выступаюць супроць імпэрыялісцкіх плянаў польскага фашызму, актыўна змагаюцца супроць фашысцкай дыктатуры, у абарону Савецкага Саюзу. Узрост ваенна-падрыхтоўчае работы польскага фашызму, узмоцненая антысавецкая кампанія выклікаюць сярод самых шырокіх мас рабочае клясы і працоўнага сялянства Польшчы хвалю магутнага адпору гэтым крывавым плянам польскага фашызму. Працоўныя Польшчы, пад кіраўніцтвам сваёй камуністычнай партыі, пераходзяць у контр-наступленьне і наступленьне супроць польскага фашызму, супроць яго антысавецкіх імпэрыялістычных плянаў.

Рост ваенных падрыхтаваньняў з боку польскіх імпэрыялістых павінен яшчэ больш узмацніць пільнасьць і баявую гатоўнасьць шырокіх працоўных мас Савецкага Саюзу. Фантастычныя надзеі польскіх фашыстых падпісаць зьмененую канстытуцыю ў акупаваным Кіеве разаб'юцца аб сілу нашай Чырвонай арміі, аб узрастаючую магутнасьць нашага сацыялістычнага краю. Нашы сілы—гэта невычарпаныя сілы працоўных Савецкага Саюзу, якія будуюць сацыялізм, якія гатовы ў любы момант грудзьмі абараніць сваю мірную працу, гэта адначасова—сілы міжнароднага рэвалюцыйнага пралетарыяту, які змагаецца ў абарону Савецкага Саюзу.

Фашысцкая Польшча прыстасоўвае чыгунку для хэмічнай вайны

ВАРШАВА, 14. У працягу доўгага часу фашысцкі ўрад сыстэматычна праводзіць мілітарызацыю чыгункі. За апошні час польскі ўрад інтэнсыўна праводзіць рад мерапрыемстваў для прыстасаваньня чыгункі для мэтаў хэмічнае вайны.

Для гэтага ўводзяцца спэцыяльныя хэмічныя вагоны, на якія трацяцца вялізарныя сродкі.

Паводле мабілізацыйнага пляну, кожная чыгуначная дырэкцыя павінна мець у сваім распараджэньні некалькі дзесяткаў такіх вагонаў.

У польскім друку мы знаходзім нататку аб перадачы аднаго такога вагону варшаўскаму чыгуначнаму вузлу. Гэты вагон абсталяваны ўсёй зброяй хэмічнага нападу. Абсталяваньне гэтага вагону абышлося паводле даных фашысцкіх газэт у 170.000 злотых. На ўрачыстай перадачы гэтага вагону прысутнічалі афіцыйныя прадстаўнікі польскага ўраду.

Прысутнічалі на мітынгу.

Зьнішчыць галавацяпствы

ПРЫ АДВОДЗЕ ЗЯМЕЛЬ ІНДЫВІДУАЛЬНІКАМ

За апошні час у НКЗ БССР прыяжджаюць сялянскія дэлегацыі, упаўнаважаныя ад асобных вёсак са скаргамі на няправільныя дзеяньні пры вызначэньні зямельных вучастка ў для сяўбы індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам.

Падамо найбольш характэрныя, найбольш абураючыя факты з ліку тых, аб якіх пішуць ў гэтых скаргах.

Вёска **Астравы** ў складзе 110 двароў **(Самахвалавіцкі раён, Меншчына).** Сяляне ўказваюць, што ў калгасе зараз налічваецца толькі 6 сялянскіх двароў і некалькі адзінак, якія ня маюць інвэнтару. Зямляўпарадкаваньне ўсёй гэтай вялікай вёскі праведзена няправільна, у некаторых сялян індывідуальнікаў забралі нават іх сяліба-гародніня вучасткі.

На зусім новае зьявішча ўказваюць у сваёй скарзе сяляне сяла **Гарадзец, Рагачэўскага раёну (Бабруйшчына).** Там пры зямляўпарадкаваньні пад калгас адведзены некаторыя зямельныя вучасткі хутаром, якія не ўвайшлі ў калгас. І вось, каб задаволіць зямлёй гэтых хутаран, рашылі іх часова—на час пасеўнай кампаніі—пасадзіць на зямлю іншых хутаран, якія засталіся на сваіх вучастках: засявайце, моў, разам, у кампаніі. Гэта—зусім галавацяпскае вырашэньне пытаньня, бо сяляне-хутаране, не кулакі, не падлягаюць раскулачваньню і маюць права карыстацца тымі вучасткамі зямлі, якія знаходзяцца ў іх эксплёатацыі, за які яны плацяць падатак па акладным лісьце. Такое перасяленьне незаконна і можа толькі сарваць сяўбу ў гэтых гаспадарках.

У вёсцы **Ясьновічы, Самахвалавіцкага** раёну, пры адводзе зямлі калгасу загарадзілі індывідуальным гаспадаркам доступ да выпасу.

У вёсцы **Вялікія Хальнявічы, Чарэйскага раёну (Аршаншчына),** пры адводзе зямлі калгасу забраны сялібныя і гародніня вучасткі тых сялян, якія не ўвайшлі ў калгас. Гэту няправільнасьць трэба неадкладна выправіць. На такую-ж акалічнасьць скардзяцца сяляне вёскі **Каменская Горка, Расьнянскага раёну (Аршаншчына).**

Сяляне вёскі **Ляскі, Глускага раёну (Бабруйшчына),** скардзяцца, што 53 двароў, якія не ўвайшлі ў калгас, не адведзены вучасткі пад засеў яравога кліну. На неадвод яравога кліну—скардзяцца і сяляне—хутаране **Сіраціскага раёну** (Віцебшчына), якія не ўвайшлі ў калгас імя Тэльмана. Сяляне вёскі **Магільна, Вузьдзенскага раёну (Меншчына),** у сваёй скарзе зазначаюць, што 96 двароў не ўказаны яравы клін і папарнае поле, ня вернуты пасеўныя матар'ялы і плугі, якія раней пры ўступленьні ў калгас былі здадзены для абагуленьня, пры чым плугі не адрамантаваны і насеньне не ачышчана.

У вёсцы **Агароднікі, Юравіцкага раёну (Мазыршчына),** дзякуючы няправільнаму разьмеркаваньню сярод індывідуальнікаў зямель, якія засталіся па-за межамі калгасу, атрымалася тое, што рад беднякоў і сераднякоў ня маюць дзе сеяць, бо тыя вучасткі зямлі, якія вызначаны з запаснага фонду, або яшчэ заняты лесам, або прадстаўляюць сабой сьпучыя пяскі.

Сяляне вёскі **Хралоўка, Касьцюковіцкага раёну (Магілеўшчына),** скардзяцца на тое, што, забраўшы іх зямлю пад калгас, ім замест гэтага даюць зямельныя вучасткі для засеву на адлегласьці 25 вёрст ад іх вёскі.

НКЗ ужо аддаў распараджэньне аб праверцы гэтых фактаў і выпраўленьні дапушчаных памылак.

Рэдакцыя «Зьвязды» са свайго боку прапануе раённым праўленкомам і сваім брыгадам неадкладна праверыць указаныя ў гэтых скаргах факты і прыняць самыя тэрміновыя меры да зьнішчэньня перагібаў і галавацяпству, калі яны ў сапраўднасьці, мелі месца. Аб выніках расьледваньня просім паведаміць «Зьвязду» па тэлеграфу, або сьпешнай поштай.

У Мсьціслаўшчыне памылкі ўпарта не выпраўляюцца

Гэта перашкаджае пасьпяховаму ходу сяўбы

З некаторых вёсак Мсьціслаўшчыны прыходзяць весткі аб тым, што ў апошнія дні ўзмацніўся прыліў у калгасы. Некаторыя калгасы, якія раней разваліліся, пачынаюць зноў арганізоўвацца. У калгасы зварочваюцца ў першую чаргу беднякі і маламоцныя сераднякі, асабліва ў тых мясцох, дзе адбыліся ўдалыя пробныя выхады ў поле калгаснікаў.

Так, у калгас імя Чарвякова ўступіла новых 15 членаў, у калгас «Чырвоны Амсьціслаўль» — 8. Па Татаршчыцкім сельсавеце падана 50 заяў аб прыёме ў калгас. У гэтым жа сельсавеце зноў з'арганізаваўся калгас, які нядаўна распаўся. Гэткія-ж факты азначаны і па другіх сельсаветах.

Такім чынам, ня толькі спыніўся адліў з калгасаў, але з кожным днём расьце прыцёк у іх новых членаў. З аднаго боку гэта тлумачыцца дружным, арганізаваным выхадам у поле раду калгасаў, а з другога боку — правільным растлумачэньнем артыкулу тав. **Сталіна** і апошніх дырэктыў ЦК па паасобных паселішчах, вёсках.

Трэба, аднак, падкрэсьліць, што прыцёк у калгасы быў бы значна большым, калі-б ня рад наступных перашкод.

Папулярызацыя артыкулу тав. **Сталіна** і апошніх дырэктыў партыі і ўраду настаўлена ня ўсюды на належнай вышыні. У радзе месц раёну аб іх ня ведаюць ня толькі сяляне, але нават пасобныя камуністы і камсамольцы. На апошняй раённай нарадзе беднаты, напрыклад, дэлегаты падкрэсьлівалі, што значная частка калгаснікаў і індывідуальнага бядняцка - серадняцкага сялянства ня ведае аб мерапрыемствах партыі і ўраду ў галіне калектывізацыі і пашырэньня пасеўнай плошчы.

Там жа, дзе мерапрыемствы папулярызуюцца, гэта часта не ўвязваецца з практычным выпраўленьнем дапушчаных перагібаў. У паасобных мясцох яны нават паглыбляюцца.

Напрыклад, ёсьць такія камуны, нядаўна арганізаваныя, якія ня мелі ніякіх падстаў існаваць, як камуны, а між тым яны да апошняга часу не пераводзацца на статут с.-г. арцелі. У выніку мы маем выхад да 50 проц. калгаснікаў з гэткіх камун.

Перагібы паглыбляюцца і пры зямляўпарадкаваньні. Інтарэсы бядняцка - серадняцкіх індывідуальных гаспадарак у асобных мясцох ня ўлічваюцца, нават у тых выпадках, калі ад адводу ім лепшай і больш блізкай зямлі зусім не закранаюцца інтарэсы калгасаў. Яравы клін вельмі часта адводзіцца індывідуальным гаспадаркам... на пляне—адбываецца, гэтак званы, папяровы адвод. Сельсаветы ня прымаюць удзелу ў падзеле яравога кліну на асобныя палосы паміж індывідуальнымі гаспадаркамі. У выніку такіх няўважлівых адносін да адводу яравога кліну індывідуальным бядняцка - серадняцкім гаспадаркам заблытваюцца зямельныя адносіны.

Да арганізацыі дапамогі індывідуальным бядняцкім гаспадаркам яшчэ ня прыступлена. Камітэты сялянскай узаемадапамогі бязьдзейнічаюць. Ніякай работы сярод беднаты не вядзецца.

Райпаляводсаюз не прыстасаваўся да абслугоўваньня індывідуальных гаспадарак. Ён нават ня мае пляну працы ў гэтай галіне.

Найгорш абстаіць справа з скарыстаньнем крэдытаў. Не скарыстаны крэдыты на закупку машын, насеньня, кармоў для калгасаў і бядняцкіх гаспадарак.

Абслугоўваньне калгасаў з боку раённых арганізацый моцна кульгае. У калгасах не хапае кармоў. Між тым малочна - жывёлагадоўчы саюз не клапоціцца аб ліквідацыі гэтых недахопаў. Пастаўленыя саюзам 570 кароў па калгасах знаходзяцца ў самым безгаспадарчым становішчы, не забясьпечаны кормам.

Самым вузкім месцам калгасаў зьяўляецца недахват цяглавай сілы. У раёне засталося шмат дробных калгасаў, якія яднаюць ад 10 да 25 гаспадарак. Зямлі ў гэтых калгасах шмат, бо ім прырэзалі кулацкія землі, запасныя фонды. Зусім зразумела, таму, што ў гэтых калгасах адчуваецца недахоп патрэбнай колькасьці коняй. Неаказаньне дапамогі цяглавай сілай пагражае вялікім зацятненьнем сяўбы ў радзе калгасаў.

Бязьдзейнасьць мясцовых арганізацый і прапягваньне перагібаў выклікала ўзмацненьне шкодніцкай дзейнасьці кулацтва. З прычыны адсутнасьці работы з беднатой адзінкавыя беднякі трапілі нават пад уплыў кулацкіх элемэнтаў.

Мясцовым арганізацыям трэба зараз-жа перабудаваць на сапраўды бальшавіцкія тэмпы і асаблівую ўвагу зьвярнуць на разгортваньне працы сярод беднаты. Трэба ўрэшце ўзяцца за рашучую ліквідацыю перагібаў і перакінуць сваю ўвагу на забясьпечэньне выкананьня пляну сяўбы ў калгасах і індывідуальных бядняцка - серадняцкіх гаспадарках.

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ.

Адвод зямлі індывідуальнікам яшчэ ня скончаны

БАБРУЙСК. (Па тэлефону ад наш. карэспандэнта). Сяўба ў індывідуальным сэктары пакуль што разгортваецца слаба. Пляны пашырэньня пасеўнае плошчы ў радзе месц да двара не даведзены. Зусім нездавальняюча ідзе абмен гатунковага насеньня. Крэдытныя т-вы яшчэ не перабудавалі сваёй работы і вельмі мала робяць для дапамогі беднаце і маламоцным серадняком. Адвод зямлі індывідуальным бядняцка - серадняцкім гаспадаркам выкананы ў разьмеры 75 процантаў.

На здымку старыя сейбіты калгасу імя Чарвякова вышлі ў поле.

ЯШЧЭ 900.000 РУБ. КРЭДЫТАЎ БЯДНЯЦКІМ ГАСПАДАРКАМ

Праект пастановы СНК БССР

Белкалгасбанк унёс у СНК БССР праект пастановы аб павялічэньні крэдытаваньня мерапрыемстваў па веснавой кампаніі ў індывідуальным сэктары.

Паводле праекту, з агульных сродкаў, вызначаных па крэдытным пляне сыстэмы сельска - гаспадарчага крэдыту на машынаазабесьпячэньне, 30 проц. будзе накіравана на крэдытаваньне закупкі машын бядняцка серадняцкімі гаспадаркамі.

З рэзэрву Беларускай канторы Калгасбанку будзе выдзелена 100.000 руб. на крэдытаваньне набыцьця коняй бядняцкімі чырвона - партызанскімі і чырвона - гвардэйскімі бясконнымі гаспадаркамі і 80.000 руб. на набыцьцё коняй для калгасаў з пераважна батрацка-бядняцкім складам.

З сум, вызначаных плянам на ўгнаеньне, пасьля задаваленьня запатрабаваньняў сацыялістычнага сэктару, будуць крэдытавацца бядняцка - серадняцкія гаспадаркі на закупку ўгнаеньня.

З мэтай пашырэньня травасеяньня і тэхнічных культур у раёнах жывёлаводчага і ільнаводнага напрамку бядняцка - серадняцкія гаспадаркі будуць крэдытавацца насеньнем траў і льну ў разьмеры да 30 проц. ад агульнай сумы вызначаных на гэту мэту крэдытаў.

Для крэдытаваньня бескароўных бядняцкіх гаспадарак і гаспадарак былых чырвоных партызан і чырвонагвардзейцаў будзе выдзелена крэдытаў на набыцьцё імі рагатай жывёлы ў суме 200.000 руб.

Усе гэтыя мерапрыемствы фактычна павялічаць суму крэдытаваньня індывідуальнага сэктару на 900.000 руб., з якіх 460.000 руб. — на набыцьцё машын, 130.000 руб. — на травасеяньне, 40.000 руб.—на насеньне ільну, 200.000 руб. на набыцьцё рагатай жывёлы і 100.000 руб. — на набыцьцё коняй.

Прыклад дрэннай падрыхтоўкі

У калгасах Вузьлянскага сельсавету, Самахвалавіцкага раёну, да гэтага часу пануе поўная неразьбярыха. Рабочая жывёла ўсё яшчэ не абагулена і інвэнтар не адрамантаваны.

Горш за ўсё справа абстаіць у калгасе Леніна. Аграном, які там працуе, выкарыстоўваецца не па прызначэньні. Старшыня калгасу, замест таго, каб параіцца з аграномам, камандуе ім, загадвае рабіць тое, што можа з посьпехам выканаць кожны пісьменны член праўленьня, як напрыклад, зрабіць улік коняй, пасеньня ў калгасе і г. д.

Да 10 красавіка яравы клін калгасам яшчэ ня быў вызначаны з прычыны адсутнасьці каморніка. Прышлося мабілізаваць настаўніцтва для вызначэньня зямельнай тэрыторыі калгасу. Ня гледзячы на тое, што ў калгасах Вузьлянскага сельсавету ўжо месяц як працуе аграном Пракапчук, калгасам яшчэ ны зроблены абмен насеньня, не праведзена кантрактацыя.

Наогул калгасы сельсавету вельмі слаба падрыхтаваліся да сяўбы.

БЯРОЗАЎ.

Папяровая творчасьць Чашніцкага райпаляводсаюзу

У канцы сакавіка камуна «Чырвоны Барацьбіт» атрымала ад Чашніцкага райпаляводсаюзу паперку наступнага зьместу:

«Затарфаваная плошча ў веснавую с.-г. кампанію павінна быць павялічана ад 30 да 42,5 проц., а таму па вашай эканомі належыць затарфаваньню плошча ў 1.615 гэкт. Райкалгассаюз яшчэ раз прапануе неадкладна выканаць гэту дырэктыву».

Зразумела, калі-б Чашніцкі райпаляводсаюз ведаў, што ў яго робіцца ў раёне, дык ён-бы такое паперкі ня пісаў, бо наша камуна мае ўсяго 800 гэкт., а ня 1.615 гэкт., як паказана ў паперцы. Нават калі-б у камуне і было столькі гэктараў, дык каб угнаіць такую плошчу з разьліку 4.800 пуд. торфу на адзін гэктар, патрэбна 7.752.000 пуд. торфу, які магчыма вывезьці на поле на прадягу 20 дзён, маючы ня менш, як 3.052 кані. Камуна-ж мае ўсяго каля 200 коняй, якія заняты і на іншых работах.

Акрамя гэтага райпаляводсаюз павінен бы-бы ведаць, што такога балота, дзе можна было-б узяць 7.752.000 пуд. торфу, на абшарах камуны няма. Вывад ясны: райпаляводсаюз проста ня ведае сапраўднага стану калгасаў.

ВЕРБАЛОЗА.

Ад рэдакцыі: Мы згодны з аўтарам, што дырэктывы райпаляводсаюзу не рэальны. Але ўсё-ж такі мы чакаем ад аўтара вестак аб тым, што сапраўды зроблена камуной у галіне тарфаваньня

З вялікім уздымам

ЧАРЭЯ (ПА ТЭЛЕГРАФУ). У РАЁНЕ 54 КАЛГАСЫ З 63 ПАЧАЛІ ЎЖО ВОРЫВА. 4 КАЛГАСЫ ВОРАВА ЎЖО КАНЧАЮЦЬ. РАЗАМ З КАЛГАСАМІ ПАЧАЛІ ВОРЫВА 25 ПАСЕЛІНІЧ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ГАСПАДАРАК. КУЛАКІ ЗРАБІЛІ СПРОБУ САРВАЦЬ СЯЎБУ У КАЛГАСАХ. З ГЭТАЙ МЭТАЙ ЯНЫ ПАДАЛІЛІ НЕКАЛЬКІ БУДЫНКАЎ КАЛІАСЬНІКАЎ У ВЁСЦЫ ЛУКОМЛІ. ПАЖАР СВАЯЧАСОВА БЫЎ СПЫНЕНЫ. РАБОТА НА ПАЛЁХ ПРАЦЯГВАЕЦЦА З ВЯЛІКІМ УЗДЫМАМ.

РАЁННАЯ КАМІСІЯ.

Не хапае трактарыстых

Скончаны пасеў канюшыны

ДРЫСА (па тэлеграфу). У Дрысенскім раёне большасьць калгасаў ужо пачала палявыя работы. **Скончаны пасеў канюшыны.** 10-га красавіка пачала працаваць трактарная калёна. **З-за адсутнасьці трактарыстых трактарная калёна працуе толькі у адну зьмену.**

Ёсьць выпадкі супраціўленьня паасобных працаўнікоў выпраўленьню дапушчаных перагібаў. Так, напрыклад, у некаторых мясцох затрымліваецца зварот маемасьці вышаўшым з калгасаў сялянам да пераходу на новы статут. Ёсьць таксама і паасобныя выпадкі няпоўнага звароту маемасьці памылкова раскулачаным серадняком.

Індывідуальным гаспадаркам яравы клін вызначаны поўнасьцю.

У значнай частцы калгасаў не хапае кармоў. Крэдыты на пакупку кармоў не вызначаны.

За апошні дні пасьля выхаду калгаснікаў у поле і апублікаваньня ім гот калгасам, 100 гаспадароў падалі заявы аб прыёме іх у калгасы.

РАЁННАЯ КАМІСІЯ.

КАЛГАС „АКТЫВІСТЫ“ АДМАЎЛЯЕЦЦА... АД ПРЫЁМУ НОВЫХ ЧЛЕНАЎ

Зараз-жа выправіць гэту грубую палітычную памылку

ВОРША. (Наш кар.). Калгасы Аршаншчыны пачалі ўжо палявыя работы. У калгасе імя XII-га зьезду КП(б)Б у першы-ж дзень выхаду ў поле ворыва пачалося адразу ў 8-мі вёсках — вытворчых вучастках калгаса. Гледзячы на добра арганізаваную дружную працу калгаснікаў, многія сяляне, якія раней вышлі з калгасу, падалі заявы аб прыняцьці іх зноў у калгас. За 2 дні работы калгасам імя XII-га зьезду засеяна 327 гэкт. забаранавана каля 500 гэкт. У калгасе праведзены першы засеў віка - сянная мешаніны па плошчы 6 гэктараў.

Вельмі добра і арганізавана пачалі сяўбу калгасы імя Леніна і «Актывісты». **Многія сяляне вакольных вёсак пасьля выхаду ў поле калгасу «Актывісты» падалі заявы аб прыёме іх у калгас. Але праўленьне калгасу у гэтым адмовіла, раючы пачанаць да восені, бо зараз быццам нельга маць межы калгасу. Гэта палітычная памылка праўленьня калгасу паз зараз-жа быць выпраўлена. Жадаючыя павінны быць прыняты ў калгас. За імі пойдзе і рэшта сялянства.**

Першы выезд у поле калгасу «Перамога», Самахвалавіцкага раёну.

Пасеўныя пляны даведзены да двара фармальна

У Чачэвіцкім раёне (Магілеўшчына) 12 калгасамі ахоплена 10 проц. гаспадарак раёну. Усе калгасы пераведзены на новы статут.

Адчуваецца недахват цягавай сілы, бо ў калгасы ўступіла шмат бясконных беднякоў. У раёне ня ведаюць добра, дзе і ў якім калгасе не хапае цягавай сілы, бо такога ўліку не вядзецца. Больш добра стаіць справа з інвэнтаром, якім калгасы забясьпечаны ў патрэбнай колькасьці. Інвэнтар поўнасьцю адрамантаваны.

Запасы кармоў у раёне разьмеркаваны няправільна. У выніку ў некаторых калгасах не хапае кармоў. Прымаюцца меры да выпраўленьня гэтых недахопаў.

Калгасы пачалі ўжо сяўбу. Раньнімі культурамі ўжо засеяна 120 гэкт. Сярод калгаснікаў вельмі добры настрой. На полі яны працуюць з вялікім уздымам.

Кепская справа і з формай аплаты працы ў калгасах. **Ні адзін калгас но ўстанавіў яшчэ формы аплаты. Райкалгассаюз гэтым пакуль што не займаўся.** Партыйныя ячэйкі не зварачаюць належнае ўвагі на работу сярод беднаты.

Гэта скарыстоўвае кулак, які вядзе агітацыю за зрыў засеўнай кампаніі, за выхад з калгасу. У Падсельскім сельсавеце кулакі абяцаюць бедняком забясьпечыць іх інвэнтаром, калі яны ня пойдуць у калгас. Ёсьць факты, калі кулакі проста тэрарызуюць бедняков і сераднякоў. **Аднак, барацьба з гэтай кулацкай агітацыяй вядзецца вельмі слаба.**

Белсельтрэст ня ведае аб ходзе сяўбы ў саўгасах

У саўгасах БССР пачалася сяўба. Аб вялізарным значэньні пасьпяховага правядзеньня сяўбы ў савецкіх гаспадарках гаварыць ня прыходзіцца. Але, на жаль, сказаць, як ідзе сяўба ў саўгасах немагчыма. Белсельтрэст, які кіруе саўгасамі, ня мае ніякіх вестак з месц аб ходзе сяўбы, бо не арганізаваў гэту

Няма таксама і ў саўгасах... ...ктыву ... двухзьмен... Як выконв... цох такса... Ці можа... ня маючы... ...ганізацыі... ...ня ведае... ...ня ведае... ...ня ведае

...урныя сцэны ў лат-війскім сойме

...оймавая варта пры дапа-...озе сац. фашы...стых сілаю ...ыдаляе з залі рабо-ча-сялянскіх дэпутатаў

РЫГА, 15. Пры абмеркаваньні капітэрысу латвійскага міністэрства земляробства дэпутат Рабоча-сялянскай фракцыі Цукурс рэзка крытыкаваў рацыю рэформу. Дэпутат заявіў, што ...а амаль нічога не дала безьзямельным ...лянам, сельска-гаспадарчаму пралетарыяту і паогул працоўным Латвіі. Цукурс сказаў: «З гэтай трыбуны буржуазныя і сацыял-дэмакратычныя дэпутаты ...іста называюць сойм «высокім домам». ...б скрыць яго сапраўдны тып тавар. Гэта ня высокі дом, а цэнтр спекуляцыі, чорная біржа, рынку, дзе ідзе самая агіднейшая спэкуляцыя—продаж, дзе нелегальным спосабам ...адаюцца інтарэсы пралетарыяту»... ...ры апошніх словах у залі падымаецца ...ні шум і крык. Старшыня сойму, сацыял-дэмакрат Калніньш, пазбаўляе Цукурса слова.

На дапамогу Цукурсу сьпяшаць усе ...шныя дэпутаты рабоча-сялянскае фракцыі, адбываецца сутычка.

Затым слова бярэ дэпутат Яршоў і, ...арачаючыся да сойму, гаворыць: «Ад імя рабоча-сялянскай фракцыі мы самым рашучым чынам пратэстуем супроць фізычнай расправы з прадстаўнікамі рэвалюцыйнага пралетарыяту. Цукурс сказаў пра сойм вельмі правільна. Чуйце-ж тут не вядзецца самы цынічны гандаль інтарэсамі працоўных? Усё ...та адбываецца ў сваім адкрыта. Сваім ...ідлем вы ўжо давялі да жабрацтва працоўнае сялянства Латвіі. Вы пра...ваводзіце эксплёатацыю рабочую кляс. Цукурс выказаў толькі думку ўсяго ...ацоўнага народу. Я цалкам далучаюся да гэтай заявы сойму».

Калніньш выклікае салдат і дыя гвардыя выводзіць Яршова з залі.

...ЕНГЕЛЬСКАЯ ВАЕННАЯ БАЗА НА ТЭРЫТОРЫІ НАРВЭГІІ

СТОКГОЛЬМ, 12. Як паведамляюць з ...ло, у сувязі з тым, што ангельцы ...рнулі нарвэскі порт Кірчэнэ, які ляжыць у Бальтыцкім моры—недалёка ад ...нскае заточкі, ў пастаянную базу для ...іх ваенных суднаў, дэпутат Шэфла за ...тау урад, ці дапушчальна, каб Англія ...ла ваенную базу на чужой тэрыторыі ...ці не зьяўляецца гэта дэманстрацыяй ...проць суседняй краіны?

Прэм'ер Мувінкель адказаў, што хаця ...гельскія ваенныя судны ні ў чым не ...рушылі ўмову свайго знаходжаньня ў ...рвэгіі, усё-ж гэты факт зьявіў на ...бе ўвагу. Нарвэскі ўрад вынесься на ...гай прычыне з ангельскім урадам, які ...паўніў Нарвэгію, што ангельскія суд...ы, што ахоўваюць рыбакоў, будуць заходзіць у Кірчэнэ толькі для забесьпя...ння правіянтам і вугляем.

Арганізацыя белагвардзейскіх атрадаў у Лёндане

ЛЁНДАН, 14. Орган рабочае партыі ...эйлі Гэральд» сёньня публікуе пад ...галоўкам «Дзівасная змова белай ар...ыі ў Лёндане» — матэрыялы, якія кідаць сьвятло на супраць куцепаўшчы-ны і ўсёй антысавецкай кампаніі і вы...ваюць сувязь расійскіх белагвардзейскіх арганізацый з афіцыйнымі коі Англіі і Францыі. Згадваецца і кал...ватыўнай «Морнінг Пост», выступ...ючай падбуджэньшчыцкай ў рэлігійнай ...ісавецкай кампаніі.

...азета зазначае, што спэцыяльныя ...ктывы Скотленд Ярда энэргічна ...вучаюць дзейнасьць атрадаў «белаў...ых» пікіраўнікоў змовы. Высьвятляецца, ...о фальшывае пахішчэньне Куцепава ...ло выкарыстана як прычына для ...ббоачнай работы белагвардзейскіх ...ганізацый. 27-га сакавіка ў газэце ...рнінг Пост» была апублікавана па...пная аб'ява: асобы, якія спачува...ь дзейнасьці генэрала Куцепава, га...а адважнага салдата і заклапочаны ...лёсам, прапануецца зьвязацца з ...Р 3785 на адрасе «Морнінг Пост». ...Дэйлі Гэральд» заўважае, што асобы, ...а адгукнуліся на гэтую аб'яву, атры...лі загадны цыркулярны ліст, у якім ...ачалася, што адрасат павінен лі...ь сябе зьвязаным самай сьвятчэн...ай клятвай і дзейнічаць у якасьці «ба...ай клеткі» і ў інтарэсах ажыцьцяў...ньня мэтаў антысавецкага руху; ад...ат павінен вербаваць у сваёй коле...б, якія на іх прыродных якасьцях і ...тасардэчнай адданасьці справе мож...будзе надзяліць на дальшае наступныя ...эгорыі: 1) асабовы склад арганізацыі сілы, асобы гэтае катэгорыі—салды, маракі, лётнікі і г. д. пазнины ...ь гэтых, на першым закліку расій...ага цара-імператара і кампандзіра ...ачынаючы ад нижэйшага ранга, пачаць службу сярод 2) Асобы, якія сакуль жадаюць прыхаваньні ...здольнасьці і красамоўства або ...ічныя веды, патрэбныя пры распра...цы праектаў. Цыркуляр заканчваецца ...ньнем мэтаў арганізацыі: 1. Вы...ць Куцепава шляхам вырадзіньня ...ага, або шляхам захопу савецкіх за...нікаў за яго, 2. Адпаўшыць перазм у ...і. Спачуваючым прапануецца павер...ць, ці жадаюць яны прыступіць ...канфэрэнцыі. Письмовыя паведам...ленні аб гэтым павінны пасылацца ...з спэцыяльнае адрасное прадпрыем...а «Моналарт».

ПАМЯЦІ МАЯКОЎСКАГА

«Правда» сёньня ў рэдакцыйным артыкуле пад загалоўкам «Поэт революции» піша: «Мы асуджаем самагубства Маякоўскага за ўход з рэвалюцыйнага паста. Бяссэнсоўная сьмерць яго да таго ня ўвязваецца з усім яго жыцьцём, так не матывуецца ўсёй яго творчасьцю да апошняга ўчора напісанага радка, што адчуваецца ўсімі ня толькі трагічная памылка, але, і як катастрофа, прычыны якой трэба шукаць у толькі што перанесенай цяжкай хваробе.

Маякоўскі — паэта футурысты лефавец, прыйшоў да рэвалюцыі сваімі асаблівымі шляхамі. У рэвалюцыі-ж ён ішоў нашым агульным шляхам. Намёр вялікі рэвалюцыйны паэта, намёр вялікі майстар пісьменьніцкага цэху, настомны каменшчык сацыялістычнай будоўлі.

Яго жыцьцё, яго літаратурная дзейнасьць былі прысьвечаны выкананьню гэтай цяжкай задачы — бальшавіцкаму «пераабурдоўванню» нашай пляны. Яго кнігі «Все сто томов моих партийных книжек» — яшчэ паслужаць пралетарыяту і кампартыі ў тэй барацьбе, якую мы вядзем.

І няхай помнікам яму будзе «Построенный в боях социализм».

Дзівасна, незразумела

Дзівоснасьць, незразумеласьць трагічнага так нечаканага канца паглыбляецца яго абыдзенасьцю, якая зусім ня ўвязваецца з арыгінальным абліччам паэты Маякоўскага.

І гэты жудасны сваёй нязначасьцю прадсьмяротны ліст. Хіба гэта матывіроўка? Чаго яму не хапала? Гэтаму вельмі талянавітаму і прызнанаму паэце.

Інакш, як рантоўным часовым правалам сьвядомасьці, стратай унутранай арыентыроўкі, хваравітай абвостранасьцю асабовых перажываньняў, вострым псыхозам — не магу гэта тлумачыць.

Проста ня верыцца, што ўсё гэта адбылося, што ўсё гэта непаправімае, і што недапісана, абарваная назаўсёды адна з самых моцных, яркіх, свяжасаблівых, непаўторных старонак найлепшай кнігі, дзе сабраны багацьці рускай паэзіі.

Дзям'ян Бедны.

Склад камісіі па арганізацыі пахаваньня Маякоўскага

МАСКВА, 14. Сакратарыят федэрацыі савецкіх пісьменьнікаў арганізаваў камісію па арганізацыі пахаваньня Маякоўскага. У камісію ўвайшлі т. т. Асееў, Енаў, Кержынцаў, Малышкін, Агнёў, Фэдзікс Кон, Лежава, Лебядзінскі, Хапатай і інш. Цела пісьменьніка з 10 гада. 15-га красавіка будзе знаходзіцца ў будынку клюбу пісьменьнікаў.

Пахаваньне адбудзецца 17-га красавіка

МАСКВА, 15. 17-га красавіка а 3 гадзіне дня ў Маскве ў клюбе фэдэрацыі савецкіх пісьменьнікаў адбудзецца грамадзянская паніхіда памяці Ўладзіміра Маякоўскага. Вынас цела ў 4 гадзіны 45 хвілін. Крэмацыя ў 6 гадз. 30 хв. Арганізацыю пахаваньня ўзяў на сябе Маскоўскі савет.

Ля гроба дзяжурыць гапаровая вайсковая варта маскоўскай пралетарскай дывізіі.

17-га красавіка фэдэрацыя выпускае экстраны нумар «Літаратурнай газэты», прысьвечаны Ўладзіміру Маякоўскаму. Літаратурныя вечары ленінградзкіх пісьменьнікаў, назначаныя на 15-га і 16-га красавіка ў політэхнічным музэі, таксама прысьвячаюцца нябожчыку. 16-га красавіка ў 7 гада. вечара ў Доме Друку адбудзецца вечар памяці Маякоўскага.

Удзел у пахаваньні прымуць прафсаюзныя, камсамольскія і піянэрскія арганізацыі, ВНУ, ВТНУ, камвузы, літаратурныя, выдавецкія арганізацыі і прадстаўнікі рэспублік. Камісія рэкамендуе арганізацыям сродкі, сабраныя на вянкі, уносіць у фонд дапамогі пачынаючым пісьменьнікам імя Ўладзіміра Маякоўскага, які арганізаваны пры фэдэрацыі.

***

Сёньня, а 10-й гадз. раніцы цела Маякоўскага было перанесена ў клюб усесаюзнай фэдэрацыі пісьменьнікаў. Усю ноч ля цела зьмянялася ганаровая варта з сяброў пакойніка і прадстаўнікоў грамадзкіх арганізацый.

Днём пахаваньня прызначана 17-га красавіка, калі адбудзецца крэмацыя.

ДАСЬЛЕДВАНЬНЕ МОЗГУ МАЯКОЎСКАГА

Мозг Маякоўскага ўчора паступіў у Дзяржінстытут мозгу. Вага мозгу — 1.700 грам. Сярэдняя вага чалавечага мозгу — 1300—1350 грам. Дасьледваньне мозгу адбудзецца ў бліжэйшыя дні.

Рэвалюцыйны пралетарыят Латвіі энэргічна рыхтуецца да 1-га мая

РЫГА, 14. Атрад паліцыі напаў на рабочую масоўку, арганізаваную ў сувязі з падрыхтоўкай да 1-га мая. Буржуазныя і сацыял - дэмакратычны друк сьцьвярджае, што «Камінтэрн рыхтуе на 1 мая крывавыя непарадкі». Рабочы патрабуе ад улады прыняцьця «рашучых мер», яўна падрыхтоўваючы напад на рэвалюцыйныя прафсаюзы і разгром іх.

Ня гледзячы на паліцэйскі тэрор і цкаваньне друку, рэвалюцыйныя рабочыя настойліва рыхтуюцца да 1-га мая. У Рызе і радзе іншых гарадоў адбываюцца арышты найбольш актыўных рэвалюцыйных рабочых.

Падрыхтоўка да 1 мая ў Заходняй Беларусі

Правакацыя фашысцкага друку

ВІЛЬНЯ, 14. Рабочыя г. Вільні і правінцыі ажыўлена рыхтуюцца да першамайскіх дэманстрацый. У радзе фабрык, заводаў і прафсаюзаў Вільні, а таксама ў мястэчках і вёсках адбыліся зьлізарныя масавыя мітынгі.

Першамайская кампанія ў Зах. Беларусі ў гэтым годзе адбываецца пры надзвычайнай хвалі масавых рэпрэсій.

Адбыліся шматлікія вобыскі і арышты.

Віленскі фашысцкі друк распаўсюджвае правакацыйныя чуткі аб «паспаньніках з Менску», якія нібыта спэцыяльна прысланы Камінтэрнам для правядзеньня першамайскай кампаніі.

Рэвалюцыйны пралетарыят Латвіі энэргічна рыхтуецца да 1-га мая

Заключэньне часовага ангельска-савецкага гандлёвага дагавору

ЛЁНДАН, 14. Адказваючы на запытаньні ў палаце абшчын таварыш міністра замежных спраў Дальтон заявіў, што перагаворы аб заключэньні часовага гандлёвага дагавору з СССР, да часу, калі будзе заключаны канчатковы дагавор, скончаны. У аспоўным бакі прыйшлі да згоды. Паводле слоў Дальтона, у аснову дагавору пакладзены прынцыпы найбольшай спрыяльнасьці для абодных бакоў у адносінах да гандлю і прынцыпы роўнапраўя для грамадзян абедзьвюх дзяржаў з некаторымі спэцыяльнымі выключэньнямі, якія датычаць суднаходзтва. Дагавор дае права савецкаму ўраду мець у Лёндане гандлёвую дэлегацыю, якая карыстаецца дыплёматычнымі прывілеямі і недатыкальнасьцю, што пашыраецца таксама на памяшканьні, занятыя дэлегацыяй.

Дальтон адзначыў, што часовы дагавор, ад якога абодны бакі могуць адмовіцца з папярэджваньнем за 6 месяцаў, будзе, як спадзяецца, уведзены ў дзеяньне ў бліжэйшы час да заключэньня канчатковага гандлёвага дагавору.

ЗЬЕЗД ПРАЦАЎНІКОЎ ВАЕННАЙ АДМІНІСТРАЦЫІ

ВАРШАВА, 14. У Варшаве распачаўся зьезд ваеннай адміністрацыі польскай арміі.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Яшчэ больш згуртоўваючы свае рады наўкола ленінскага ЦК, бальшавіцкая партыя ідзе да XVI-га зьезду гатовай да новых баёў і перамог на фронце сацбудаўніцтва

ДА XVI ПАРТЗЬЕЗДУ

Праз 2 месяцы адкрываецца XVI Зьезд Усесаюзнай Камуністычнай Партыі (бальшавікоў). Зьезд падагуліць вынікі гіганцкай работы партыі па сацыялістычным будаўніцтве за гады з XV Зьезду, якія прайшлі пад знакам непрымірымай і пасьлядоўнай барацьбы за ленінскую лінію УсеКП(б).

Іменна тое, што гэтыя гады прайшлі пад знакам бязьлітаснай барацьбы за лінію партыі як з правым ухілам—асноўнай небясьпекай, так і «левымі» загібамі, з зьлучкамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму, — забясьпечыла рашаючыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, дасягнутыя рабочай клясай пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі.

Да часу XV-га Зьезду партыя ў асноўным выкрыла трацкістых, якія спрабавалі рэвізаваць асновы ленінізму, якія спрабавалі сьцягнуць партыю ў меншавіцкае балота. І XV-ты Зьезд у поўнай адпаведнасьці з воляй партыі паставіў трацкістых па-за партыйнымі радамі. Замацаваўшы поўную перамогу партыі ў барацьбе з трацкізмам, XV-ты Зьезд выразна вызначыў далейшыя шляхі будаўніцтва сацыялізму ў краіне, ухваліўшы свае гістарычныя пастановы аб тэмпах індустрыялізацыі, аб сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і выпрацаваўшы праграму разгорнутага наступленьня на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі.

Няўхільна праводзячы ў жыцьцё пастановы XV-га Зьезду і наступных пленумаў Цэнтральнага Камітэту, партыя цьвёрда абаранала чыстату сваёй ленінскай лініі. Партыя своячасова і рашуча накіравала агонь непрымірымай барацьбы супроць праваапартуністычнай небясьпекі, якая зьявілася спачатку адлюстраваньнем дробна-буржуазных хістаньняў, а потым і кулацкага супраціўленьня нашаму сацыялістычнаму наступленьню. Цьвёрда выконваючы асноўны ленінскі прынцып—змагацца на два франты, накіроўваючы асноўны ўдар супроць галоўнай на даным этапе небясьпекі,—наша партыя здолела своячасова ацаніць сутнасьць праваапартуністычных хістаньняў асобных элемэнтаў партыі, пераросшых потым з абастрэньнем клясавай барацьбы ў адкрыты праваапартуністычны ўхіл. Не паслабляючы барацьбы з рэшткамі контррэвалюцыйнага трацкізму, рашуча ўдараючы па левых настроях, партыя сканцэнтравала галоўную ўвагу на барацьбе з правымі апартуністымі, якія сталі палітычнымі агентамі кулацка-капіталістычных элемэнтаў, і з прымірэнцтвам да правага апартунізму. Толькі пры гэтай умове, разгортваючы бальшавіцкую дзейсную самакрытыку, партыя здолела з посьпехам вырашыць рад важнейшых задач і праблем сацыялістычнага будаўніцтва. Толькі пры гэтай умове партыя здолела забясьпечыць «ПАВАРОТ асноўных мас сялянства на шлях сацыялістычнага разьвіцьця праз калектывізацыю», здолела мабілізаваць рабочую клясу на пасьпяховае выкананьне пяцігодкі, здолела ЛЕРАЙСЬЦІ ад палітыкі абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулака да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе сацыяльнае калектывізацыі.

Ва ўмовах КП(б)Б час, які прайшоў з XV-га Зьезду, адзначаны цэлым радам вялізарных посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, адзначаны цэлым радам вялізарных посьпехаў у галіне ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі. Гэтых посьпехаў КП(б)Б здолела дасягнуць толькі таму, што яна няўхільна змагалася на два франты, з правым ухілам—галоўнай небясьпекай і «левымі» загібамі, якія граюць на руку праваму ўхілу, з нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі ўсіх колераў.

XVI-ты Зьезд УсеКП(б) ня толькі падагуліць вынікі работы партыі па сацыялістычным будаўніцтве, ня толькі падагуліць посьпехі партыі па індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі вёскі, але і вызначыць далейшыя шляхі нашага будаўніцтва, вырашыць рад асноўных гістарычных задач сацыялістычнага наступленьня. І таму зусім зразумела, што партыйныя арганізацыі павінны разгарнуць самую шырокую, самую актыўную падрыхтоўку да XVI-га Зьезду, павінны праверыць усе вучасткі свае работы, павінны прыйсьці да XVI-га Зьезду яшчэ больш згуртаванымі наўкола ЦК партыі.

Асноўнай задачай падрыхтоўкі партыйных арганізацый да XVI-га Зьезду зьяўляецца патрэбнасьць яшчэ больш узмацніць сваю барацьбу з правымі і «левымі» апартуністымі, якія спрабуюць атакаваць генэральную лінію партыі.

Правыя апартуністы, бясспрэчна, паспрабуюць (і спрабуюць) скарыстаць дапушчанай ў радзе месц памылкі і перагібы ў практыцы калгаснага руху, для новых атак на генэральную лінію партыі, для новых спроб дыскрэдытаваць партыйнае кіраўніцтва.

Гэтым спробам партыйныя арганізацыі павінны даць самы бязьлітасны, самы жорсткі і своячасовы адпор. Кожная партыйная арганізацыя павінна добра памятаць, што «іменна таму, што Зьезд партыі адыгрывае такую гіганцкую ролю, — наўкола падрыхтоўкі да яго заўсёды ажыўляюцца апазыцыйныя групоўкі, наўкола Зьезду партыі актывізуюцца ня толькі сябры, але і ворагі партыі» («Правда»). Таму кожная парт-арганізацыя павінна праявіць бальшавіцкую пільнасьць, павінна праявіць ленінскую непрымірымасьць, каб быць здольнай даць бязьлітасны адпор усялякім спробам правых і «левых» апартуністых дыскрэдытаваць партыйнае кіраўніцтва, усялякім спробам апартуністых правага і «левага» толку атакаваць лінію нашай партыі.

Адсюль відавочна, што для таго, каб пасьпяхова разгарнуць падрыхтоўку, партыйныя арганізацыі павінны яшчэ больш разгарнуць дзейсную бальшавіцкую самакрытыку, накіраваць зброю гэтай самакрытыкі на бязьлітаснае выкрыцьцё правага ўхілу — асноўнай небясьпекі і «левых» загібаў, якія пьюць ваду на млын правага апартунізму, рашуча адмятаючы прэч усялякую спробу пад сьцягам самакрытыкі дыскрэдытаваць генэральную лінію партыі і яе бальшавіцкае ленінскае кіраўніцтва.

Яшчэ больш згуртоўваючы свае рады наўкола ленінскага ЦК УсеКП(б), яшчэ больш узмацняючы непрымірымую барацьбу з правымі і «левымі» апартуністымі, бальшавіцкая партыя ідзе да XVI-га Зьезду гатовай да новых баёў і перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Т.

Выправім свае памылкі

Жорсткі адпор антыпартыйным вылазкам апартуністых

Слуцкі раённы камітэт партыі не разгарнуў своячасова барацьбы з перагібамі і скажэньнямі партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве. Бюро райкому ня ўдарыла па праваапартуністычных скажэньнях і «левых» перагібах, меўшых месца ў арганізацыі. Між тым у раёне пры правядзеньні калектывізацыі было дапушчана грубае скрыўленьне партыйнай лініі. Рад партыйных ячэек насаджваў калгасы пры дапамозе адміністраваньня і недапушчальнага каманданьня. Асобныя партыйцы замест растлумачальнай работы рознымі пагрозамі прымушалі сялян уступаць у калгасы. Сакратар ленінскай ячэйкі КП(б)Б Макаўчык дайшоў нават да таго, што зьбіваў асобных беднякоў і сераднякоў. Зусім ня дзіва, што ў раёне частка калгасаў была «папяровая». Раённы камітэт не мабілізаваў партыйнай арганізацыі на барацьбу з гэтымі перагібамі і скажэньнямі партыйнай лініі. Гэту сваю грубую палітычную памылку раённы камітэт цалкам і поўнасьцю прызнаў. Ва ўхваленай пасатновае бюро РК, між іншым, гаворыцца.

«Бюро РК КП(б)Б адзначае сваю палітычную памылку ў тым, што, канстатуючы факты перагібаў і скрыўленьняў партлініі ў рабоце па калектывізацыі, ня прымала рашучых мер супроць канкрэтных праяў перагібаў і адміністраваньня.

Рад работнікаў, якія скажалі лінію партыі і не жадалі выпраўляць сваіх памылак, зьняты з работы.—Гэтымі днямі адбыўся раённы сход партыйнай арганізацыі, які абмеркаваў даклад аб выніках сакавіковага пленуму ЦК КП(б)Б. Партарганізацыя рашуча асудзіла дапушчаныя перагібы і скрыўленьні. Аднак, асобныя партыйцы з ліку перагібішчыкаў (Серада, Вайнэр, Вігдаровіч) ня толькі ня асудзілі дапушчаных імі скажэньняў партыйнай лініі, а наваг адкрыта выступілі з заявамі аб тым, што яны «ні ў чым не вінаваты». Замест таго, каб стаць на шлях прызнаньня сваіх памылак, гэтыя «партыйцы» імкнуліся апраўдаць сваё галавацяпства, зьняць з сябе віну за дапушчаныя імі злачынныя скажэньні і перагібы. Пры гэтым яны пайшлі на ўласьцівы апартуністым манэўр, спрабуючы дыскрэдытаваць партыйнае кіраўніцтва, імкнучыся апраўдаць дапушчаныя імі перагібы і скрыўленьні тым, што... «ЦК партыі дапусціў рад памылак».

Сход сурова асудзіў гэтыя антыпартыйныя вылазкі апартуністых. Ва ўхваленай рэзалюцыі партыйная арганізацыя прызнала дапушчаныя памылкі і рашуча падкрэсьліла патрэбнасьць безадкладна поўнасьцю ліквідаваць скажэньні і перагібы ў практыцы калгаснага будаўніцтва і пасьлядоўна разгортваць барацьбу з правымі і «левымі» апартуністымі.

А. К.

Калгасьнікі ўступаюць у партыю

(Магілеўшчына)

У **Бялыніцкім** раёне, пры арганізацыі калгасаў былі дапушчаны грубыя перагібы і скажэньні партыйнай лініі. Многія мясцовыя работнікі, у тым ліку і камуністыя, стваралі калгасы унтэр-прышыбеевускімі мэтадамі. Вынікам гэтых перагібаў і скажэньняў зьявіўся частковы адліў з калгасаў.

Зараз партыйныя ячэйкі рашуча выпраўляюць свае памылкі. Пасьля апублікаваньня артыкулу тав. **Сталіна «Головокружение от успехов»** і пастановы ЦК УсеКП(б) частка ячэек раённай арганізацыі разгарнула вялікую агітацыйна - растлумачальную работу, якая да апошняга часу кульгала на абедзьве нагі.

У **Вугольніцкім** сельсавеце партыйная ячэйка здолела хутка і своячасова ліквідаваць дапушчаныя перагібы. Сярод наўкольных батракоў, беднякоў і сераднякоў была праведзена шырокая работа па растлумачэньні артыкулу тав. **Сталіна.** У выніку ў калгасах зусім спыніўся адліў. **Перадавыя калгасьнікі пачалі падаваць заявы аб прыёме ў КП(б)Б.** Прыцёк заяў настолькі павялічыўся, што Вугольніцкай ячэйцы прышлося стварыць новую кандыдацкую групу. У групу ўвайшлі 9 калгасьнікаў - беднякоў, якія прыняты ўжо ў партыю. Цэлы рад заяў яшчэ не разабраны. Ячэйка энэргічна ўзялася за ўмацаваньне работы сярод батрацтва і беднаты. У калгасах створаны батрацка - бядняцкія групы. Беднякі і серадняк, якія выйшлі з калгасаў, пачалі **падаваць калектыўныя заявы аб прыёме назад.**

Галоўчыцкая парт'ячэйка правяла вялікі сход калгасьнікаў, на якім абмеркавала артыкул тав. **Сталіна.** Калгасьнікі прынялі пастанову, у якой цалкам і поўнасьцю ўхвалілі артыкул тав. **Сталіна.** Па гэтым жа сходзе ячэйка прызнала свае памылкі, дапушчаныя ў яе практычнай рабоце па калектывізацыі. Ячэйка рашуча асудзіла перагібы і скрыўленьні і ўхваліла рад мерапрыемстваў па іх выпраўленьні. Рашучае і хуткае прызнаньне ячэйкай сваіх памылак і іх выпраўленьне выклікалі прыліў новых членаў у калгас. Паказальна, што пасьля гэтага сходу зусім спыніўся адліў з мясцовага калгасу. Ячэйка арганізавала батрацка - бядняцкую групу. **Дзесятні перадавых батракоў і беднякоў калгасьнікаў пачалі падаваць заявы аб прыёме ў партыю. Бараўская партыйная ячэйка арганізавала новую калгасную кандыдацкую групу.**

С.

Пленум Магілеўскага АК КП(б)Б

МАГІЛЕЎ, 15. (Наш кар.). Адбыўся напаўраны пленум Магілеўскага АК КП(б)Б. Пленум шырока абгаварыў і асудзіў меўшыя месца перагібы ў галіне калектывізацыі, а таксама пастанову ЦК КП(б)Б, да якой поўнасьцю далучаецца. Пленум вывеў са складу бюро АК т. т. **Перахода** і **Данілава.**

Сакратаром АК абраны т. **Чарнушэвіч.**

На радасьць кулаку

(Крупскі раён)

У сьнежні мінулага году **Сакаловіцкі** сельсавет быў урачыста абвешчаны сельсаветам суцэльнай калектывізацыі. Якія былі для гэтага паставы—невядома. У сельсавеце ня было праведзена ніякай папярэдняй работы сярод беднаты і серадняцтва, ня было таксама ні аднаго калгасу, які-б быў арганізаваны раней сьнежня. Але сакратар райвыканкому **Яцук,** будучы прымацаваным да Сакаловіцкай ячэйкі КП(б)Б, упэўніваў раённы камітэт партыі, што ў Сакаловіцкім сельсавеце ёсьць «усе ўмовы для правядзеньня суцэльнай калектывізацыі». І вось Сакаловіцкі сельсавет, дзе беднякі і сераднякі амаль нічога ня ведалі пра калгасы, арабіўся сельсаветам суцэльнай калектывізацыі. Практычную работу па суцэльнай калектывізацыі пачаў разгортваць **Яцук.** Як ён разгортваў—добра паказваюць наступныя факты.

На сходзе ў вёсцы **Сакаловічы,** некаторыя беднякі і сераднякі адмовіліся ўступіць у калгас. **Яцук** пачаў прымушаць іх абавязкова ўступіць у калгасы. На запытаньне—ці можна так рабіць—ён адказаў:

— Можна. Зараз мы будзем пад прымусам заганяць у калгасы.

Пасьля такога «растлумачэньня» сялькор **Шарапаў** заявіў, што калі сялян прымусова заганяць у калгасы, дык з такіх калгасаў нічога ня будзе. У адказ на гэта разьюшаны Яцук назваў тав. Шарапава контр-рэвалюцыянэрам, а на другі дзень арыштаваў яго. Тав. **Шарапаў** быў накіраваны ў міліцыю, а адтуль ў **Воршу** ў папраўчы дом. Цэлы месяц прасядзеў тав. **Шарапаў** у папраўчым доме, пакуль гэтай ганебнай справай не зацікавіўся акруговы пракурор. Шарапава, зразумела, вызвалілі. Але Яцук застаўся непакараным. Разам з Шарапавым быў арыштаваны яшчэ адзін «агітатар» супроць калгасаў —селянін-бядняк, які таксама адмовіўся ісьці на загаду Яцука ў калгас. Яцук параілеўшаму «праводзіў» калектывізацыю ў Сакаловіцкім сельсавеце. Усіх сялян, нежадаючых уступаць у калгасы, пазбавілі выдачы хлеба з каапэрацыі, награжалі ім, што яны будуць высланы і г. д. У в. **Красноўка** Яцук заявіў сялянам, нежадаючым уступіць у калгас, што ён іх арыштуе.

Так у Сакаловіцкім сельсавеце праводзілася суцэльная калектывізацыя. Як жа цяпер сакаловіцкая партячэйка выпраўляе гэтыя злачынныя скажэньні партыйнай лініі? Ячэйка і зараз упарта адмаўляецца прызнаць свае памылкі. Яна яшчэ і цяпер заяўляе беднаце і серадняцтву, што Яцук правільна праводзіў калектывізацыю. Асобныя члены ячэйкі (С. Мігаль і інш.) замест прызнаньня сваіх памылак заяўляюць, што «артыкул т. Сталіна «Головокружение от успехов» зьяўляецца памылковым і што гэты артыкул у лепшым выпадку трэба было разасласць сакрэтным парадкам». Гэтым шкодным поглядам ячэйка ня толькі не дала рашучага адпору, але фактычна згадзілася з імі.

Відавочна, што ячэйка сур'ёзна хварэе, што яна спаўзла з лініі партыі, спаўзла з клясавых рэек. Аб гэтым сьведчыць тое, што ячэйка, дапусьціўшы рад грубых перагібаў і скажэньняў, ня толькі ўпарта адмаўляецца і ня хоча іх прызнаць і выправіць, але і паранейшаму ня спыняе скажаць лінію партыі. Ячэйка дапускае памылку за памылкай. Нядаўна адбыліся перавыбары праўленьня калгасу. Сярэдняка **Шарапава** ў склад праўленьня недапусьцілі. Ячэйка лічыла, што ў склад праўленьня нельга ні ў якім разе дапускаць сераднякоў. Гэта грубае антысерадняцкае скажэньне нарэшце вылілася ў ганебную агідную расправу над тав. Шарапавым. Ячэйка за тое, што тав. Шарапаў выступіў супроць галавацяпства Яцука, лічыць яго (Шарапава) «контррэвалюцыянэрам». Для таго, каб расправіцца з тав. Шарапавым, ячэйка найшла на злачынны па сутнасьці маневр. Яна разам з сельсаветам і начальнікам міліцыі ўпадабкавала тав. Шарапава ў індывідуальным парадку і прызначыла яго да раскулачваньня. Між тым, тав. Шарапаў плаціць с.-г падатку ўсяго... 2 руб. 50 кап. У рэшце згадзіліся з гэтай злачыннай пастановай аб «раскулачваньні» селькора тав. Шарапава. Так распраўляліся ня толькі над тав. Шарапавым. Мясцовыя прышыбеевы раскулачылі рад іншых малазаможных сераднякоў, раней упадабкаваўшы іх у індывідуальным парадку. І гэта праводзілася, ня гледзячы на адкрыты і рашучы пратэст вясковай беднаты, абуранай злачынным «раскулачваньнем» сераднякоў.

Так дзейнічалі галавацяпы Крупскага раёну. Гэтыя агідныя скажэньні і перагібы ня выпраўлены яшчэ да гэтага часу. Канкрэтныя вінаватыя, ня гледзячы на тое, што **ўсе гэтыя факты вядомы акруговаму камітэту партыі,** ня прыцягнуты да адказнасьці. Партыйная ячэйка, якая іграе на руку клясаваму ворагу, да гэтага часу не аздаровлена.

А. М.

Супроць скажэньня беларусізацыі

У нашых умовах вялікадзяржаўны шавінізм выяўляецца галоўным чынам у пасыўным супраціўленьні беларусізацыі. Ва многіх установах «супраціўленцы», прыкрыўшыся казённай адпіскай ваюць беларусізацыю тым, што ігнаруюць якасьць беларускай мовы ў пісьмовай працы, у гутарках, у выніку чаго атрымліваецца самае агіднейшае скажэньне палітычнага лёзунгу беларусізацыі.

Так, у пісьмовых матар'ялах установы Магілеўшчыны можна часта знайсьці такія «перлы»:

«Праізвясьці пытаньне аб класіфікацыі абанентаў на электрасьвет з прычынай наступленьня максымальнага памяншканьня ліку абанентам, выключэньне сьвету дапускаць ліш па ўважыцельным прычынам» (Быхаўскі гарсавет).

«Незабясьпечанасьць нармальнага натуральнага лесаадналёленьня з прычынны: сутнічаньня ў значнай часьці агарожы, слабага прымяненьня мер увасабленьня натуральнага лесаадналёленьню, спазьлясьніцтвам»... і г. д. (акруговы зямельны аддзел).

У такой форме пішуцца ў вёскі паказаньні, абежнікі, паведамленьні, даступаюць на сялянскіх сходах некаторыя працаўнікі вышэйпаказаных устатасты, каб гаварылі па зразумелай мове. А гэтыя заявы «гаварэце на зразумелай мове, мове» скарыстоўваюцца паціху вялікадзяржаўнымі шавіністымі, як аргумэнт, што «беларуская мова выдумка», «селянін ня ведае беларускае мовы».

Вось якімі заблытанымі на першы погляд шляхамі дзейнічаюць «супраціўленцы» беларусізацыі ў нашых установах. А бюракраты з установу спакойны. Яны выконваюць дырэктывы аб беларусізацыі: «Паперкі пішуцца пабеларуску, працаўнікі гавораць пабеларуску, які-ж тут вялікадзяржаўны шавінізм?». І ка...ма справы да таго, ці зразумела ўсё тое, што напісана ў гэтых паперках, ці набліжае такая «беларусізацыя» наш апарат да мас? Бюракрат ня хоча разумець таго, што пытаньне аб мове ўсіх загадаў, цыркуляраў, распараджэньняў тычным, зьяўляецца пытаньнем палітыкі ня прамысловасьцю, сацыялістычнай рэканструкцыяй сельскае гаспадаркі, усёй нашай гаспадаркай.

Між тым, такая форма супраціўленьня беларусізацыі — нежаданьне павышаць якасьць беларускае мовы—пашырана ня толькі ў Магілеўшчыне. Праверка нацкамісіі ЦВК стану беларусізацыі ў 29 установах Менску паказала, што большасьць працаўнікоў імкнецца вывучаць беларускую мову толькі па слоўніках, не жадае павышаць якасьць мовы праз чытаньне мастацкай літаратуры, у жывой гутарцы і г. д. А гэта, бязумоўна, рату ад мас.

Трэба ўзьняць кампанію за павышэньне якасьці беларускай мовы нашых самавецкіх установ, прафэсыянальных, грамадзкіх арганізацый, прыцягнуць да адказнасьці падобных «супраціўленцаў» беларусізацыі. Барацьба супроць блытаніны, мешаніны, скажэньня беларускае мовы ня ёсьць у нашых умовах толькі барацьба супроць бюракратызму мовы, але і самая бязьлітасная жорсткая барацьба з вялікадзяржаўным шавінізмам, які імкнецца выбіць з рук пралетарыяту яго магутную з

Па ячэйках Асоавіяхіму

Праз Асоавіяхім навучацца вайсковай справе

Створым Асоавіяхімаўскія лягеры

Апошнімі гадамі ў розных мясцох Саюзу ствараліся і атрымалі шырокае распаўсюджаньне лягеры Асоавіяхіму.

Гэтыя лягеры зьяўляюцца асобай формаю і мэтадам работы, пры дапамозе якой шырокія пласты працоўных ахопліваюцца асоавіяхімаўскай работай, знаёмяцца бліжэй з распарадкам, укладам і бытам вайсковых часьцей і правядзяць у здаровых умовах свой водпуск.

Сёлета Цэнтральны Савет Асоавіяхіму СССР прызнаў патрэбным адкрыць шырокую сетку лягераў Асоавіяхіму па Савецкім Саюзе.

Асноўныя мэты лягераў — гэта, даўшы здаровы і разумны адпачынак працоўнаму, завяршыць і паглыбіць тыя вайсковыя веды, якія мае наш асоавіяхімавец.

Лягеры дадуць практычныя навыкі, уцягненьне ў палявую работу тым таварышом, якія займаліся ў гурткох вайсковых ведаў. Наш камандзір запасу асьвежыць свае камандныя навыкі і практыку работы ў полі.

Працоўныя жанчыны, якія скончылі заняцьці ў гурткі і курсы, атрымаюць практычную вайсковую падрыхтоўку.

Члены Асоавіяхіму, якія зусім ня маюць вайсковай падрыхтоўкі, змогуць яе атрымаць.

ЦС Асоавіяхіму БССР ужо прыступіў да арганізацыі лягераў у некаторых акругах. Дана заяўка на палаткі, выпукаваецца сродкі.

Але гэтага мала.

Стварэньнем лягераў павінна зацікавіцца ўся праптеарская грамадзкасьць.

У першую чаргу гэтым пытаньнем павінен заняцца **камсамол**. Бо асноўная маса, якая наведвае лягеры і адчувае патрэбу ў вайсковай падрыхтоўцы — гэта працоўная моладзь, і камсамол павінен карыстацца гэтымі лягерамі для шырокага ахопу моладзі ў мэтах яе ваяннізацыі.

Акрывыканкомы і гарсаветы павінны асыгнаваць сродкі на абсталяваньне лягераў, Галоўсацстрах і прафсаюзы — на харчаваньне, цэрабкопы павінны арганізаваць сталоўкі, прадуктовыя ларкі, чайныя і забясьпечваць лагершчыкаў усім патрэбным. Наркамасьветы, паводле прыкладу «МОНО», павінен выкарыстаць лягеры для ваяннізацыі настаўнікаў і выдаць на гэтую мэту сродкі.

Уся работа ў лягерах павінна не стаміць адпачываючага і не засушыць асноўнай мэты лягераў — асьвяжыць вайсковыя веды. Адсюль задача — забясьпечыць лягеры спартыўнымі прыладамі, гульнямі, футболам, спорт-гарадком, арганізаваць спэцыяльную водную станцыю, школу плаваньня, абсталяваць яе лодкамі, байдаркамі, вадзянымі лыжамі — гэта значыць, усё прыстасаваць да таго, каб даць разумны адпачынак і фізычна загартаваць адпачываючага.

ЦС Асоавіяхіму выдасьць сродкі на аплату інструктароў, утрыманьне лягераў, на стрэльбы. дапамогі і заняткі.

Кожны адпачываючы ў лягерах прабудзе ад 12 да 14 дзён, з якіх 10 дзён выкарыстае на заняткі, 2—на адпачынак і на падагульваньне таго, што далі лягеры. Заняткі разьлічаны толькі на 5 гадзін у дзень, а рэшту часу — на разумны і культурны адпачынак.

У Маскве сродкі на ўтрыманьне лягераў далі Массавет, МГСПС і Сацстрах. Пры іх дапамозе Масасоавіяхім яшчэ ў мінулым годзе арганізаваў аднадзенныя лягеры, якія маюць вялізнае значэньне пры бесьперапынцы.

Працоўны прыяжджае ў любы дзень у гэтыя аднадзенныя лягеры і прымае ўдзел ў рашэньні лёгкай тактычнай задачы, знаёміцца з тапаграфіяй у полі і ён атрымлівае цікавы і карысны адпачынак і адначасова ўзмацняе свае вайсковыя веды і навыкі.

Каля Менску і іншых гарадоў можна выкарыстаць муніцыпалізаваныя ў гэтым годзе дачы, баракі і іншыя памяшканьні.

Санаторнае абслугоўваньне лягераў павінен узяць на сябе Беларускі Чырвоны Крыж.

Лягеры Асоавіяхіму ў Беларусі павінны быць.

Іх арганізацыю і адкрыцьцё трэба прыстасаваць да 10-й гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапалякаў. Гэта будзе добрым укладам у справе ўзмацненьня абароназдольнасьці нашага краю.

Наколькі няўважліва часамі падыходзяць у нас да пытаньня ваяннізацыі, могуць служыць такія факты: УсеЦСПС прызначае з культфонду 4 проц. на работу па ваяннізацыі членаў прафсаюзаў, а ЦСПСБ пастанавіў выдаваць толькі 3 проц. Работнікі Наркамасьветы лічаць, што за лета трэба працусьціць праз лягеры толькі 100 чалавек і асыгнаваць па адным рублі на кожнага.

Наша прыгранічнае становішча патрабуе ад нас большай увагі да пытаньняў ваяннізацыі і ўзмацненьня абароназдольнасьці краю. Лягеры павінны быць і яны будуць.

М. В.

Новыя ільготы Асоавіяхімаўцам

Для замацаваньня і ўдасканаленьня вайсковае падрыхтоўкі сярод членаў Асоавіяхіму, Рэвваенсавет Саюзу ўстанавіў рад ільгот тым, хто праходзіць вайсковую падрыхтоўку ў асоавіяхімаўскіх гурткох і на курсах.

Дапрызыўнікі, якія прайшлі вайсковую падрыхтоўку на вучэбных пунктах або гурткох вайсковых ведаў і вытрымалі іспыты, вызваляюцца ад праходжэньня дапрызыўнай падрыхтоўкі.

Па-завайскавіком, якія прайшлі падрыхтоўку на вучэбных пунктах або ў гурткох вайсковых ведаў і вытрымалі іспыты, скарачаецца тэрмін абавязковага 6-цімесячнага навучаньня.

Чырвоныармейцы запасу, прайшоўшыя перападрыхтоўку на вучэбных пунктах або гурткох, вызваляюцца на месяц ад збораў.

Ільготы даюцца і асобам малодшага, сярэдняга і старэйшага начскладу.

Усе гэтыя катэгорыі не прыцягваюцца ў гэтым годзе ў якасьці інструктароў на дапрызыўных і па-завайскових зборах.

Рэвваенсавет даручае штабу РСЧА распрацаваць спэцыяльнае палажэньне аб абавязковым вайсковым навучаньні ў арганізацыях Асоавіяхіму. Адначасова зварачаецца ўвага камандаваньня акруг і часьцей на тое, каб арганізацыям Асоавіяхіму, якія праводзяць абавязковае навучаньне, была дана дапамога і поўная садзейнасьць шляхам дачы памяшканьня, зброі, стрэльбішч і дапамог, што значна палепшыць вучобу ў гурткох.

Загад Рэвваенсавету Саюзу аб ільготах асоавіяхімаўцам гаворыць аб тым, што работа Асоавіяхіму апраўдала сябе і ў далейшым павінна сустрэць яшчэ большае падтрыманьне ў шырокіх масах працоўных.

М.

Выклік прынялі, але нічога не зрабілі

Ячэйка Асоавіяхіму швэйнай фабрыкі **«Камінтэрн»** узьняла пытаньне аб пабудове самалёту «Беларускі Швэйнік». Рабочыя падтрымалі гэту думку і пастанавілі адпрацоўваць па 10 мінут штодзенна на карысьць самалёту. Былі выкліканы пасьледваць прыкладу гамільчан, швэйныя фабрыкі Менску, Віцебску і Бабруйску.

За тры месяцы «Камінтэрн» сабраў 1 адаслаў у ЦП саюзу 3.500 руб., а астатнія швэйныя фабрыкі толькі... каля 400 рублёў.

Рабочыя «Камінтэрну» зварачаюцца паўторна да швэйных фабрык Менску, Віцебску і Бабруйску з прапановай асоавіяхімаўскім ячэйкам гэтых фабрык раскалыхацца і ўзмацніць збор сродкаў, выканаць узятыя на выклік абавязацельствы і самалёт «Беларускі Швэйнік» будзе пабудаваны.

МАСЬЛЯНІКОЎСКІ.

Патрэбен рашучы пералом

У Барысаве на буйных прадпрыемствах, як на фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»**, **«Домбаль»**, а таксама і радзе іншых ячэек Асоавіяхіму ніякай асоавіяхімаўская работы не праводзіцца.

Гэтыя прадпрыемствы налічваюць вялікую колькасьць членаў Асоавіяхіму, якія жадаюць вывучаць вайсковую справу. На фабрыцы «Прафінтэрн» налічваецца многа членаў Асоавіяхіму, але ў працягу апошняга году членскіх узносаў спагнана толькі 2 руб.

Работа ячэек зусім замірае, а з боку райсавету Асоавіяхіму адсутнічае адпаведнае кіраўніцтва і апошні зусім не правярае работы ячэек.

Работа ажывілася

Акрсавет Асоавіяхіму за бязьдзейнасьць распусьціў **Уваравіцкі** райсавет Асоавіяхіму. Праведзены датэрміновыя перавыбары райсавету.

Цяпер пры апошнім арганізавана сэкцыя ваеннай падрыхтоўкі працоўных, якая ў сваю чаргу арганізавала 15 навучальна-страявых аддзілак у калгасах для вайсковай падрыхтоўкі калгасьнікаў і партыйна-камсамольская актыву. Сэкцыяй мабілізаваны ўвесь камандны склад запасу. Выпісана вайсковая літаратура на 300 рублёў.

У.

З лістоў рабселькораў

РАСЦЭНКІ НЕ ПА КІШЭНІ РАБОЧЫХ

Пральня **«Новы быт»** (Менск) за мыцьцё бялізны і іншых рэчаў устанавіла надзвычай высокія цэны. Напрыклад: за мыцьцё ватнае коўдры бярэцца 1 р. 50 к., за занавескі двайныя—1 р. 50 к., за адзінкавыя — 1 р., за жаночую сукенку—1 р. 50 к. і г. д. Гэта для працоўнага насельніцтва.

Расцэнкі ўстаноўлены гал. бухгальтарам **Рабычкам** і загадчыкам пральні паводле загаду дырэктара Абкамтрэсту.

ЗАРЭЦКІ.

ФУТЛЯРЫ ВАЛЯЮЦЦА НА ДВАРЭ

На фабрыцы **«Пралетарская Пабеда»** (Нова-Барысаў) на дварэ валяецца 6 шт. футляроў, якія былі зроблены для закрыцьця матораў. На футляры пайшло чырвонага жалеза 12 лістоў і затрачана рабочага часу каля 2 тыдняў. Прараб Пракоф'яў загад зрабіць футляры даў, а выкарыстаць іх па прызначэньні ня змог.

ПАЗБАЎЦЕ ДЗЕТСАД АД БРУДУ

У дзіцячым **садзе № 7** (Менск) пачынаюць здарацца інфэкцыйныя захворваньні. Усё гэта вынікае з таго, што на дварэ брудна, валяецца розны гной. Тут-жа, каля дому, знаходзіцца яма, дзе гасьць ванну, на дварэ выліваюцца розныя памыі. Некалькі раз садсавет падаваў заявы ў камгас, жакт, у інспэкцыю дашкольных устаноў і г. д., але ніякіх вынікаў.

Санкамісія, зьвярні ўвагу на детсад № 7.

ДАКУЛЬ ЧАКАЦЬ?

Шацкае спажывецкае т-ва зусім не клапоціцца аб забесьпячэньні спажывецкімі прадуктамі настаўнікаў. На працягу трох месяцаў настаўнікі не атрымлівалі мяса і сала, зусім мала цукру. На дзіцячыя кніжкі цукар не выдаецца. Каапэратар Вайнбэрг кажа: «Пачакайце».

Каапэратары павінны неадкладна паклапаціцца аб забесьпячэньні настаўнікаў прадуктамі.

АСЬВЕТНІК.

РАСТРАТЧЫК НЕ ПАКАРАНЫ

Старшыня **Бярозаўскага** КСУ, Глускага раёну (Бабруйшчына) **Малаковіч І.** растраціў 88 пуд. збожжа. Рэвізійная камісія гэту растрату выкрыла і справу з усімі матар' яламі накіравала ў РКСУ для перадачы справы ў суд для прыцягненьня растратчыка да адказнасьці. Але да гэтага часу (а ўжо прайшло больш за 3 м-цы) Малаковіч не пакараны і невядома дзе знаходзіцца справа.

ВЕДАЮЧЫ.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

СЬМЯЛЕЙ БІЦЬ ПА НЕДАХОПАХ!

РАБКОРЫ, БРЫГАДЫ „ЗЬВЯЗДЫ"! У ПАХОД СУПРОЦЬ КАНКРЭТНЫХ ВІНОЎНІКАЎ У ЗРЫВЕ ПРАМФІНПЛЯНУ

Злачынная безгаспадарчасьць на Віцебскім вузьле

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Рабочая брыгада ЦК чыгуначнікаў выкрыла абурачныя факты безгаспадарчасьці і шкодніцтва на віцебскім вузьле МБВ чыг. ПА ВУЧАСТКУ ЦЯГІ ПРАМФІНПЛЯН НЯ ВЫКАНАНЫ. Вучастак мае перавыдаткі за 1929-30 год больш, чым на 800.000 руб. Некаторыя паравозы знаходзіліся ў рамонце па 6-10 дзён замест 48—72 гадзін. Рамонт вядзецца нядбайна. Рабочыя слаба ўцягнуты ў абгаварэньне вытворчых пытаньняў.

Мясцоком сацыялістычным спаборніцтвам ня цікавіцца. У выніку гэтага за апошнія тры месяцы абвешчана каля 600 вымоў за парушэньне працдысцыпліны. Наўкола ўсіх гэтых зьявішч грамадзкая думка ня ўзьнята. У выніку нерацыянальнага выкарыстаньня апалу кожны месяц марна траціцца каля 6.000 руб. Па прапанове брыгады, адміністрацыя віцебскага чыгуначнага вузла прыцягваецца да судовай адказнасьці.

Катастрафічнае становішча з адгрузкай прадуктаў

На Бабруйскім камбінаце стварылася катастрафічнае становішча з адгрузкай гатовай прадукцыі. Склады піла-матар'ялаў і фанэры перапоўнены. Адных піламатар'ялаў сабралося каля 600 пляцформаў, з іх пляцформ 300 экспарту. Ляжаць таксама на складзе 35 вагонаў каштоўнай фанэры.

Валакітчыкі заходніх чыгунак зрываюць работу. Ад 1-га лютага да 10-га красавіка яны не дадалі камбінату 884 ПЛЯЦФОРМАЎ.

Далейшая марудносьць у падачы пляцформаў пагражае зрывам тэрміновых адгрузак, зрывам экспартных заданьняў. З прычыны адсутнасьці вольнае плошчы для хаваньня прадукцыі, перад камбінатам паўстае пагроза прыпыненьня работы цэхаў.

Патрэбны тэрміновыя меры для разгрузкі складаў камбінатаў, для нармальнага забесьпячэньня камбінату вагонамі.

Вінаватыя ў валакіце павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Брыгада «Зьвязды»
ФАЛЬКО, ГАЛОЎКІН, МАГІДАЎ.

Папяровыя фабрыкі ня зьніжаюць тэмпу

Горш працуе картонная фабрыка ў Рагачове

Першыя 5 дзён красавіка далі па папяровай прамысловасьці здавальняючыя вынікі. **«Чырвоная Зара»** выканала вытворчую праграму на 111,8 проц., **«Гэрой Працы»** — на 110,3 проц., **«Спартак»** — на 104,3 проц. і толькі адна фабрыка **«Прафінтэрн»** у Н.-Барысаве не давыканала праграму на 1,2 проц.

Картонныя фабрыкі перавыканалі праграму: **імя Леніна** — на 49,9 проц., **імя Вароўскага** (Сўраж) — на 16,1 проц. і толькі картонная фабрыка **імя Сталіна** ў Рагачове не давыканала вытворчай праграмы на 11,1 проц.

Вялікі посьпех фабрыкі **імя Леніна** тлумачыцца тым, што праграма фабрыкі па красавік, у сувязі з магчымай паводкай, што бязумоўна, адбілася-б на рабоце вадзяных турбін фабрыкі, была зьменшана. Але, дзякуючы таму, што паводкі ня было, фабрыка працавала бесперабойна.

Безгаспадарчасьць і нядбайнасьць кіраўнікоў Бабруйскага камбінату

Лесбел мала цікавіцца сваім буйнейшым прадпрыемствам

Тое, што здарылася на лесакамбінаце 10-га сакавіка — пагражала аварыяй электра-станцыі. З прычыны рамонту трэ' было часова выключыць частку трубы, якая падае ваду ў катлы. Інжынэр Стэрлінг (работнік трэсту «Тепло и Сила») загадаў закрыць вінціль, што і было зроблена. Сам Стэрлінг пашоў, забыўшы даглядзець, каб вінціль адкрылі зноў. Раптам на электра-станцыі заўважылі, што спынілася падача вады ў катлы. Работнікі станцыі забілі трывогу. Але ніхто ня ведаў, дзе прычына. Кінуліся шукаць інжынэра Стэрлінга, але той заявіў — «я не пайду, няхай станцыя згарыць, я яшчэ пясочкам пасыплю». Іншыя работнікі «Тепло и Сила» таксама ня выказалі патрэбнай ў крытычны момант актыўнасьці.

Толькі цяперашні галоўны інжынэр камбінату т. Ялісееў не замяшаўся і загадаў агледзець вадаправодную сетку і ў крайнім выпадку выграбсьці топкі катлоў.

Калі-б замяшанасьць, якая ўзьнікла сярод адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу пры паведамленьні, што спынілася падача вады ў катлы, яшчэ крыху працягнулася, катлы разам з электрастанцыяй камбінату ўзьляцелі-б у паветра. Ні загадчык станцыі інжынэр Федаровіч, ні старшы мэханік Чукін не змаглі адразу ўстанавіць у чым справа. А калі ўстанавілі, што ўся справа ў галоўным вінцілі трубы, дык **ніхто ня мог знайсьці гэтага вінціля.**

Трэба сказаць, што наогул на лесакамбінаце не адчуваецца гаспадарчага вока. На камбінаце да гэтага часу яшчэ ідуць будаўнічыя работы, галоўным чынам, на лініі мантажу. Зараз устаўляецца другая турбіна. Работа ідзе вельмі марудна. Прадстаўнікі трэсту «Тепло и Сила», якія вядуць гэтую работу, адчуваюць сябе на камбінаце поўнымі гаспадарамі. Былы інжынэр т. Федаровіч вельмі нядбайна адносіўся да свайго абавязку па лініі тэхнічнага нагляду—сачыць за выкананьнем заказу работнікамі «Тепло и Сила». Інжынэр Федаровіч цягнуўся ў хвасьце, штампуючы ўсё, што рабілі працаўнікі «Тепло и Сила». Асабліва гэта характарызуецца ў акце ад 30-га верасьня 1929 году, якім пацьвярджалася прыняцьце раду, як быццам, выкананых работ, а фактычна работ, якія **выконваюцца яшчэ і цяпер.**

Работнікі «Тепло и Сила» да таго ігнаравалі работнікаў камбінату, што былі нават выпадкі, калі яны работнікаў камбінату **ня пускалі на станцыю.** Работа «Тепло и Сила» і зараз ідзе бескантрольна, бо гэта арганізацыя працавала і яшчэ працуе па так званым адкрытым разрахунку, г. зн. усё тое, што яна робіць і перарабляе аплачваецца камбінатам па паданым рахунку.

Прыкладам таго, як працуюць работнікі «Тепло и Сила» можа служыць наступнае: параправод у адным месцы пачалі праводзіць пад столлю, пазьней вяючы трубы да страпільных формаў. Потым трубы зьнялі і пазалі іх праводзіць пад зямлёй, у тунэлі. І самае цікавае тое, што ўся работа прахадзіла пры адсутнасьці на руках у тэхнічнага нагляду камбінату праекту гэтай работы. Што можна сказаць аб такім тэхнічным нагляде, які ня ведае, што ён кантралюе?

Не дарма старшыня бюро ЦК камбінату інжынэр Бэркман заявіў, што каця аварыі 10-га сакавіка і ня было, але **яна магчыма і зараз,** бо тэхнічны персанал **ня ў курсе экспляатацыі электрастанцыі камбінату.** Таму ён лічыць становішча пагражаючым, заяўляючы, што ня сёньня—заўтра можа здарыцца і іншая бяда.

У становішчы на камбінаце вінаватыя ня толькі адміністрацыя камбінату. Вінаваты і Лесбел, вінаваты і ВЦНГБ, работнікі якіх да кіраўніцтва буйнейшым прадпрыемствам даволі фармальна, адносяцца наведваюць камбінат, ня маюць з ім пастаяннай сувязі і ўсё кіраўніцтва іх заключаецца толькі ў пасылцы паперак, якім бяз жывога кіраўніцтва — грошы цана.

К—н.

Сумныя весткі з „Пралетарскай Перамогі"

74,77 проц. праграмы за першую дэкаду

Пачатак другога паўгодзьдзя ня прынёс ніякіх паляпшэньняў на фабрыцы «Пралетарская Перамога». Замест 22.800 скрынь запалак фабрыка выпусьціла толькі 17.032 скрынь, што складае 74.77 проц. Такім чынам, на фабрыцы «Пралетарская Перамога» няма яшчэ пералому.

Некалькі лепш працавала «Чырвоная Бярэзіна»: замест 10.500 скрынь выпусьціла 10.270, але і яна праграмы ня выканала.

Цэх па вырабе сядзеньняў замест 10.500 даў 9.940 тузінаў.

Як відаць, фабрычныя арганізацыі яшчэ не разгарнулі патрэбнай МАСАВАЙ РАБОТЫ.

Сьпіной да вытворчасьці

ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў пасвойму разумее дырэктыву партыі аб адзінаначальні. Лёзунг «тварам да вытворчасьці» ЦП саюзу часам абарачае ў лёзунг «сьпіной да вытворчасьці».

Цікавы факт здарыўся на заводзе «Дрэваапрацоўшчык». Група ўдарнікаў выклікала другую групу перайсьці на вячэрнюю працу, бо ўдзень не хапае электраэнэргіі, таму бываюць частыя прастоі. Замест таго, каб падтрымаць ініцыятыву ўдарнікаў, ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў дае дырэктыву заўкому, каб апошні растлумачыў рабочым, што яны парушаюць прынцып аховы працы (?). Гэты факт гаворыць аб тым, што ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў далёка стаіць ад інтарэсаў вытворчасьці.

Мала цікавіцца ЦП саюзу тым, што робіцца на заводзе.

Бюро парткалектыву на сваім апошнім пасяджэньні адзначыла, што дырэктыва ЦК УсеКП(б) аб адзінаначальні зусім невыстарчальна прапрацавана. У цэхах няма, нават, правіл, якія вызначалі-б абавязкі і правы адміністрацыі цэху.

Вытворчыя заданьні не даведзены да рабочых.

АНДРЭЙ.

„Чырвоная Зорка" ня выконвае дагаворэў

9 гадзін прастою шпалернай фабрыкі па віне „Чырвонай Зоркі"

11-га красавіка шпалерная фабрыка ў Менску была вымушана спыніць працу **на 9 гадзін**, з прычыны адсутнасьці паперы. Папяровая фабрыка «Чырвоная Зорка» ў Чашніках, якая забясьпечвае шпалерную паперай шпалерную ф-ку, **ня выканала сваіх абавязкаў па своячасовай адгрузцы паперы**, ня гледзячы на тэлеграфнае напамінаньне. У выніку прастою шпалерная фабрыка недавырабіла каля 36.000 кавалкаў шпалеры.

На пашыраным бюро ячэйкі, дзе разглядалася гэтае пытаньне ў прысутнасьці дырэктара Папертрэсту **т. Кофмана**, высьветлілася, што дырэкцыя ф-кі «Чырвоная Зорка» злачынна ня выканала дырэктывы Папертрэсту аб пераходзе на выпуск шпалернай паперы з 1-га красавіка (фактычна перайшла толькі 4-га красавіка). Падругое, дырэкцыя фабрыкі ўвяла ў просты зман Папертрэст і шпалерную фабрыку, даўшы тэлеграму аб тым, што адгружаны **2 вагоны** паперы тады, калі толькі быў адгружан **адзін вагон.** Між тым, выяўляецца, што запасы гатовай паперы на фабрыцы «Чырвоная Зорка» былі.

На пасяджэньні высьветлілася, што апошні недапушчальны выпадак вынікам зусім ненармальных узаемаадносін паміж фабрыкай «Чырвоная Зорка» і шпалернай фабрыкай. Всьцішмат фактаў ігнараваньня з боку папяровай фабрыкі з прысылкай патрэбнага асартымэнту і якасьці шпалерных паперы, што навялічвае процант браку.

Бюро партыйнай ячэйкі, абмяркоўваючы гэты ганебны выпадак, ухвалі:

Прасіць ЦКК расьсьледаваць справу і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці, а таксама прасіць Папертрэст аб прыцягненьні да адказнасьці вінаватых на адміністрацыйнай лініі. Разам з тым бюро адначыла несваячасовасьць сыпалізацыі з боку адміністрацыі шпалернай фабрыкі. Адначасна было пастановлена зьвярнуцца да рабочых папяровай фабрыкі «Чырвоная Зорка» аб своячасовым выкананьні сваіх абавязкаў і паляпшэньні якасьці паперы, накіраваўшы туды спэцыяльную дэлегацыю.

К.

ЗАВОД ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА ЗРЫВАЕ ЗАСЕЎНУЮ КАМПАНІЮ

Адрамантаваныя трактары адразу-ж зноў псуюцца

Прыцягнуць вінаватых да крымінальнай адказнасьці

10-га красавіка рамонтныя майстэрні заводу імя Ланцуцкага ў Гомелі прысылалі Буда-Кашалёўскаму райкалгассаюзу тры адрамантаваныя трактары сыстэмы «Фардзон». Але рамонт трактараў аказаўся зусім нягодным. Паламаныя часткі новымі ня былі заменены. Трактар № 3 прышоў зусім бяз крыльэў. Зроблен толькі дробны рамонт і афарбоўка. У трактары № 1 рамонт зроблен ня вышэй сярэдняга. Папсаваныя часткі ня былі заменены. Трактар № 2 прайшоў толькі ад станцыі да поля на адлегласьці ½ кілёмэтра і вышаў са строю. Расплавіліся тры падшыпнікі, цячэ радыятар. Зараз трактар зноў разабраны і прабудзе ў рамонце ня менш 2-х тыдняў.

Між тым, майстэрні імя Ланцуцкага бяруць за гэты, так званы, рамонт, як за капітальны. Рамонт усіх трох трактараў каштуе 3.729 руб. 08 кап., а за гэтыя грошы можна было купіць два новыя трактары.

Дрэнны рамонт трактараў падарваў аўтарытэт райкалгассаюзу ўзвоч навукольнага сялянства. Ёсьць таксама рэальная пагроза зрыву засеўнай кампаніі, бо кепска адрамантаваныя трактары кожную мінуту спыняюць работу.

Пракуратуры і РСІ трэба прыцягнуць вінаватых да крымінальнай адказнасьці.

Буда-Кашалёўскі райкалгассаюз
А. КРЭЧКА і В. МАНАРЭНКА.

ФАБРЫЧНА-ЗАВОДЗКІ ДРУК У БАРАЦЬБЕ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ*)

Мы на парадзе ўпяршыню, пасьля двух год існаваньня фабрычна-заводзкіх друкаваных газэт, абгаворваем работу гэтага надзвычай адказнага атраду партыйна - савецкага друку па адным з найбольш адказных пучкоў — клясавае барацьбы — барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Шматтыражка, друкаваная фабрычна - заводзкая газэта — гэта ўзброенае паліграфічнай тэхнікай дзіцяцё рэканструкцыйнага пэрыяду.

Пераглядаючы камплекты фабрычна-заводзкіх друкаваных газэт, якіх у нас, на Беларусі, выдаецца звыш 40, ёсьць усе падставы, каб бяз ружовых акуляраў, бяз «похлопвания по плечу», зрабіць вынік аб тэй буйнейшай ролі, якую адыгрываюць шматтыражкі —гэтыя фабрычныя «полпреды» партыйна-савецкага друку.

Калі насьцендгазэты чытаюцца на-ляту, урыўкамі, дык друкаваныя газэты чытаюцца ня толькі на прадпрыемствах, але і ў хаце, захопліваючы, такім чынам, у кола свайго ўплыву ця толькі рабочых, але і іх сем'і.

Газэта заводу **«Двигатель Революции»** паказала яскравы прыклад масавай работы, калі, улічваючы палітычнае значэньне перавыбараў заўкому, пачала выпускаць газэту - бесьперапынку і вылучыла рабкораў ва ўсе заўкомаўскія брыгады. Вынік — 100-проц. яўка рабочых на сход і іх значная актыўнасьць.

Віцебская шматтыражка **«Мэтпромавец»** узьняла пытаньне аб тым, што маляры цэх, на чале бюро партыйнай ячэйкі, выступіў супроць рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў. Газэта з бальшавіцкай настойлівасьцю, разам з усім партыйным калектывам, пры падтрыманьні пралетарскае грамадзкасьці, дабілася ажыцьцяўленьня гэтых рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, якія далі некалькі дзесяткаў тысяч рублёў эканоміі.

Гомельская шматтыражка «Трускі» (фабрыка «Безувий») правяла агляд работы вытворчых нарад.

На фоне гэтых паасобных канкрэтных фактаў, якіх мы налічваем дзесяткі, відаць, як узрасла вага шматтыражак у палітычна - гаспадарчым жыцьці прадпрыемстваў.

Але на фоне гэтых шматлікіх станоўчых, дадатных бакоў, якія гаворыць аб вялізарнейшай ролі фабрычна-заводзкіх газэт у барацьбе за прамфінплян, нам зараз патрэбна паказаць недахопы газэты, карэньні гэтых недахопаў з тым, каб ня толькі фіксаваць факт, памылкі, але канстатуючы іх, **упор** рабіць на іх выпраўленьні, на падвышэньні якасных паказальнікаў «прадукцыі» нашых шматтыражак.

Наша асноўнае запатрабаваньне да газэт:—ня будзьце рэгістратарамі «входящих» і «исходящих» допісаў. Кожная фабрычная друкаваная газэта павінна быць рукой камуністычнай партыі, якая чула выслухоўвае пульс жыцьця.

ПЕРАЙСЬЦІ НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ БАРАЦЬБЫ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Наш друк павінен перайсьці на больш высокую ступень штодзеннай барацьбы за прамфінплян. Нам трэба браць упор на перавыкананьне прамфінпляну, на перакрыцьцё рознага роду АД'ЕКТЫЎНЫХ фактараў і «вузкіх месц» (на якія ў нас так многа любяць спасылацца), на вышукваньне ўнутраных рэсурсаў прадпрыемства з тым, каб забясьпечыць выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Між тым, «у сям'і не бяз вырадка»—ёсьць асобныя шматтыражкі, якія ня толькі ня выконваюць свае ролі ў барацьбе за прамфінплян, але фактычна ставяць палкі ў калёсы. Шматтыражка «Чырвонае шыла» (фабрыка «Труд») у артыкуле аб становішчы фабрыкі піша, прыблізна, наступнае:

«Хто вінават у становішчы на фабрыцы? Вінаваты ўсе, за выключэньнем рабочых».

Такая пастаноўка пытаньня, замест барацьбы і мабілізацыі сіл для барацьбы грамадзкасьці ўсяго прадпрыемства, толькі дэмаралізуе. Тая-ж газэта «Чырвонае шыла» дае надзвычай яскравы ўзор хвасьцізму, адсталых настрояў, калі яна невыкананьне прамфінпляну тлумачыць тым, што, бачыце, вінавата адміністрацыя і... **рэканструкцыя** фабрыкі. Гэта ўжо значыць, што аб'ектыўна газэта выкарыстоўваецца для клясава-варожых нам мэтаў. І тому зусім зразумела, як гэтая газэта «Чырвонае шыла» (якая сапраўды цяпер становіцца шылам, якога ў «мяшку» ніяк ні ўтоіш) змагла стаць аб'ектыўна рупарам рваўкіх настрояў, калі піша, што ў часе адпускной кампаніі трэба плаціць паводле сярэднягa заработку тых месяцаў, якія зьяўляюцца лепшымі ў выпуску, і ў часе, калі ў газэце сычны канвэер рвацтва! Калі да гэтага дадаць, што тая-ж самая газэта «Чырвонае шыла» піша, што «аб перавыкананьні прамфінпляну зараз і гутаркі ня можа быць», дык ёсьць усе падставы гаварыць аб палітычным банкрутстве сучаснай рэдкалегіі, трэба зрабіць і адпаведныя вынікі і аб якасьці мясцовага партыйнага кіраўніцтва, якое дапусьціла наяўнасьць у газэце сэрыі буйных палітычных памылак.

УМЕЦЬ КАНЦЭНТРАВАЦЬ УВАГУ НА ГАЛОЎНЫМ

Рад пытаньняў, якія складаюць нутро, сарцавіну барацьбы за прамфінплян, мы часта ўпускаем. У фабрычных шматтыражках няма паказу ролі вытворчых нарад, як актыўнай сілы, якая непасрэдна ўплывае на выкананьне прамфінпляну, на праверку таго, ці няма «очковтирательства», пераўмяншэньня прамфінпляну.

Замацаваньне сацыялістычнага спаборніцтва ў значнай меры залежыць ад выраішэньня пытаньня аб кіраўніцтве ўдарнікамі ня толькі з пункту погляду скліканьня канфэрэнцый ударнікаў (гэта справа добрая), ня толькі з пункту погляду «барабанных» рэзалюцый, але з пункту погляду арганізацыі працы на вытворчасьці, як цэнтральнага, рашаючага пытаньня дзеловай эфэктыўнасьці сацыялістычнага спаборніцтва.

НЯ БЫЦЬ «ПРЫЛІЗАНАЙ» ГАЗЭТАЙ!

У Гомелі, на акруговай парадзе шматтыражак, калі ўдзел шматтыражкі «Ратацыя» ў барацьбе за прамфінплян быў прызнаны незадавальняючым, дык у абарону «Ратацыі» выступіў сакратар парт. ячэйкі Палесдруку з наступнай характэрнай аргумэнтацыяй: «Як ты гаворыш аб тым, што ў нас газэта дрэнная?! Мы міжнародны дзень асьвятлялі?. — Асьвятлялі! «Юбілей Чырвонай армії асьвятлялі?» — Асьвятлялі! «Перавыбары бюро ячэйкі асьвятлялі?» — Асьвятлялі! «Чаго-ж вы яшчэ хочаце?»

Фармальна да матываў гэтага сакратара парт'ячэйкі не прыдзерэшся, а па сутнасьці — зьдзек, бо галоўнае—штодзенная, упартая, арганізаваная барацьба газэты за прамфінплян (барацьба, а ня фіксацыя фактаў) у «Ратацыі» адчуваецца слаба. **Нам трэба ў шматтыражках унікнуць небясьпекі, калі ў газэце з надворнага выгляду будзе ўсё чысьценька, усё ўсё прыгладжана, не падпалі на палічках, на кожную кампанію — матар'ял, на кожны чырвоны пісьцік у календары — артыкульчык, а галоўнае —вытворчае «нутро», будні вытворчасьці, барацьба за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады ва ўмовах данага прадпрыемства — будзе адсутнічаць.**

Газэты-«алідуўшчыцы» нам не патрэбны! Нам патрэбны газэты барацьбіты, непасрэдныя ўдзельнікі будняў нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

ДЫХАНЬНЕ БАРАЦЬБЫ ЗА ПРАМФІНПЛЯН ПАВІННА АДЧУВАЦЦА Ў КОЖНЫМ РАДКУ

Трэба ўмець прасякаць усю газэту барацьбой за прамфінплян, каб дыханьне гэтай барацьбы за прамфінплян адчувалася ў кожным радку, у кожнай літары газэты.

Уздымаючы пытаньне барацьбы за прамфінплян на прынцыповую вышыню барацьбы за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, трэба ня ўтойваць нашых цяжкасьцяй, трэба ўмець выхоўваць масы на цяжкасьцях, шляхам паказу таго, **як** перамагаць гэтыя цяжкасьці.

Шматтыражка «Рабочае вока» (гарбарня «Бальшавік») у № 57 зьмясьціла надзвычай цікавы матар'ял: ліст рабочых Клінцоўскай абутковай фабрыкі аб дрэнным прадукцыі скуранога заводу «Бальшавік». Разам з гэтым лістом «Рабочае вока» зьмясьціла адказ вытворчай нарады «Бальшавіка», які аддае душком бюракратызму, дзе дрэнная якасьць прадукцыі гарбарні «Бальшавік» тлумач

Рабкор, які ня любіць самакрытыкі

Пастановы партыйных арганізацый і апошніх зьездаў рабкораў патрабуюць ашырэньня барацьбы з асобамі, якія шкуры «рабкораў» імкнуцца скарыстаць у ўласных асабістых мэтах. У МЦРК працуе **загадчыкам магазыну № 23 рабкор Мэламэд.** Ён любіць усіх крытыкаваць, бязумоўна, добрая рыска, але ў тоўжа самы час **Мэламэд, як заўгдчык магазыну,** сам ў грубай форме зацісканае самакрытыку. Узаемаадносіны **Мэламэда,** якія абвастрыліся з цэлым радам таварышоў і арганізацый на грунце яго работы ў магазыне і зажыму самакрытыкі з яго боку, ён, Мэламэд, прыпісвае цкаваньню яго, як рабкора.

Гэтым пытаньнем займаецца зараз цэлы рад арганізацый. Што-ж мы бачым у магазыне № 23, дзе працуе Мэламэд? Цэлымі днямі Мэламэд ня бывае ў магазыне, адсутнічае належнае кіраўніцтва з яго боку, і сам ён, абураючым чынам зацісканае самакрытыку. Калі работнікі з магазыну, дзе працуе Мэламэд, выступаюць на вытворчых нарадах і паказваюць на яго недахопы, ён зразу патрабуе зьняцьця іх з работы.

Праўленьне ЦРК пасылае ў магазын, дзе працуе Мэламэд, вылучэнца т. **Савіцкага**—рабочага друкарні БДВ, які карыстаўся сярод рабочых аўтарытэтам. Тав. **Мэламэд** яго не прызнае як намесьніка. Калі т. **Савіцкі** выпісаў са складу 80 штук гатовае вопраткі, то Мэламэд ад гэтага адмовіўся, ня гледзячы на тое, што ў магазыне ня было чаго прадаваць. Праз тры дні пасьля гэтага Мэламэд сам прывёз гэтую вопратку ў магазын.

Маюць месца выпадкі, калі Мэламэд ня хоча прымаць тавараў са складу, якія даюцца прапарцыянальна усім магазынам, у выніку чаго вымушаецца трашовы зварот. У апошні месяц са складу быў забраны увесь тавар, які даваўся яго магазыну і зварот замест 35-40 тысяч павялічыўся да 80 тысяч рублёў.

Мэламэд зьдзекваецца з работнікаў магазыну, у выніку гэтага некаторыя ўпякаюць з работы. Праўленьне МЦРК ня можа падшукаць спэцыяльных работнікаў для Мэламэда. Аб гэтым сьведчыць такі факт: работніца **Кроль,** прышоўшы да т. **Каца** (старшыня праўленьня МЦРК) плакала ў працягу паўгадзіны, каб яе з магазыну, дзе працуе Мэламэд, забралі таму, што ён да яе беспадстаўна чапляецца.

Камісія па чыстцы гандлёвага апарату МЦРК склікала агульны сход у магазыне, дзе працуе Мэламэд. На сходзе выявілася, што адзін работнік магазыну—т. Каждлан—прафупаўнаважаны, на якога Мэламэд заўсёды спасылаецца, як на добрага працаўніка, сьцьвярджае, што ён, Каждлан, ня хоча выказвацца супроць Мэламэда, каб «не застацца без кавалка хлеба».

10-га красавіка ў магазыне адбыўся сход з мэтаю праверкі сацспаборніцтва. Аб гэтым ня быў паведамлены мясцком. Калі прыйшоў член мясцкому т. **Бэсаў,** то **Мэламэд** не хацеў яго пусьціць на сход. Але па патрабаваньні ўсіх прысутных, Мэламэд вымушаны быў яго ўпусьціць. Што-ж робіць Мэламэд? Ён даклад начаў рабіць на яўрэйскай мове, а да прыходу Бэсава рабіў на расійскай. Гэта рабілася з тым, каб Бэсаў (апошні расіец) не зразумеў аб чым гаворыць Мэламэд.

Каб выявіць сапраўднасьць гэтай справы, камісія па чыстцы пасылала ў магазын спэцыяльную брыгаду з вайскоўцаў. Але брыгадзе не ўдалося дабіцца чаго-небудзь, бо Мэламэд не даваў магчымасьці выявіць сутнасьць справы. Выграда ў сваіх вывадах просіць камісію зьняць з работы Мэламэда ў ЦРК.

Мэламэд імкнецца падарваць аўтарытэт усіх камісій па чыстцы апарату, не давярае ім і крычыць, што з боку камісіі ёсьць заціск самакрытыкі.

Камісія па чыстцы апарату МЦРК палічыла пакласьці канец усякім няправільным выступленьням з боку асобных рабкораў, якія пад маскай рабкораў, на справе падрываюць аўтарытет рабкораўскай арганізацыі.

І. Фукс.

На будаўніцтве Асінбуду

Недахопы і памылкі, міма якіх нельга прайсьці

Трэба сказаць некалькі слоў аб тых недахопах, якія ёсьць на Асінбудзе і якія значна перашкаджаюць пасьпяховасьці і пытаньню будаўніцтва. Да гэтага часу на Асінбудзе не разгорнута самакрытыка, ёсьць заціск, не разгорнуты спаборніцтва і ўдарніцтва, адсутнічае эканомія сродкаў і г. д. Вось прыклады.

У мінулым годзе інжынэр Цымбала, загадчык аддзелу забесьпячэньня, купіў у Маскве ў нейкага прыватніка паравозік. Для вузкакалейкі, заплаціўшы 13.000 руб. Паравозік аказаўся нядатным і зараз валяецца бяспрытульным, а грошкі вылецелі на вецер. Памер гэтае страты яшчэ больш павялічыцца, калі прыняць пад увагу, што з прычыны нядатнасьці паравозіка, была сажана надвозка торфу. Торф прышлося везьці гужам, і гэта абышлося вельмі дорага.

На Асінбудзе наогул не шкадуюць гроші, даюць усялякія прыбавачкі і плацяць пэнсію, як прадвецца. І ня шкода было-б, калі-б прыбаўкі даваліся сапраўдным спэцыялістам, а то іх даюць шпавым спэцыялістам, хлопчыкам, сваяком.

Разьезды і камандыроўкі зьядаюць шмат грошай. Па скат калёс для паравозу езьдзяць па некалькі чалавек у адзін і тоўжа горад, езьдзяць амаль што ва ўсе буйныя гарады СССР, атрымліваюць камандыровачныя і толькі, а скатаў як ня было, так і няма. Наогул, з разьездамі там ня зусім добра. Ад Выдрыцы да Араховў усяго толькі 3 кілёмэтры туды і назад, амаль праз кожную гадзіну ходзіць цягнік, але на ім ніхто з адміністрацыі ня хоча езьдзіць, і ўсе ганяюць коняй. Выдаткі на разьездах і камандыроўках перавысілі каштарыс на 100 проц.

У Выдрыцы на Асінбудзе ёсьць насьценная газэта. Але там здаровай крытыкі аб недахопах зьмяшчаецца мала, бо кожная заметка раней, як папасьці ў газэту, праходзіць суровую цэнзуру ў асобе тав. Шаршнёва, або яшчэ каго небудзь з «адказных». Калі цэнзаром не спадабаўся артыкул — яго не прапусьцяць. У насьценгазэце ня бачым такіх матар'ялаў, дзе-б гаварылася аб перавыдатканьні сродкаў, аб выкіданьні іх на вецер (паравоз), лішніх камандыроўках і г. д. Такіх заметак у насьценгазэце ня бывае.

Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва на Асінбудзе належным чынам не разгарнуліся, бо прафэсыянальная і партыйная арганізацыі яшчэ ня сталі на чале гэтага руху.

Удзел у перабудове вёскі Асінбуд прымае, але і тут ёсьць недахопы. Праводзіць калектывізацыю ў вёску пасылаліся палітычна няпісьменныя людзі, якія нарабілі шмат памылак. Адказныя працаўнікі, партыйцы, палітычна пісьменныя, сядзелі ў габінэтах і на вёску не выяжджалі.

Вось частка тых недахопаў, якія маюцца на Асінбудзе. Гэтыя недахопы павінны быць зьнішчаны. Патрэбна на Асінбудзе разгарнуць, развярушыць грамадзкую працу сярод спэцыялістых і рабочых і тым самым дабіцца выпраўленьня ўсіх памылак і недахопаў.

А. М.

Што зроблена па лістох рабселькораў

ПРЫГАВАР ПА СПРАВЕ ЗАМАХУ НА МУХІНУ СКАСАВАНЫ

Селькорка **Мухіна** (Барысаўскі раён) праз свой допіс выкрыла **Тарасэвіча,** які кataваў сваю жонку. За гэта Тарасэвіч пагражаў Мухінай, зьневажаў яе і паваг рабіў спробу пабіць яе. Нарэшце, дзе разглядалася гэта справа, прыгаварыў Тарасэвіча толькі да 3 месяцаў прымусовай працы.

Калегія Вярхоўнага суду пастанову нарсуду скасавала і перадала справу для новага разгляду Менакрсуду.

ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ АПАДАТКАВАНЬНЕ ЗЬНЯТА

Селянін **Аўсянікаў** Прахор (Хоцімскі раён) скардзіўся, што яго няправільна ападаткавалі ў індывідуальным парадку. Скарга Аўсянікава пасылалася на расьсьледваньне. Пракурор з вуч. Магілеўскай акругі паведаміў, што індывідуальнае ападаткаваньне з гр-на Аўсянікава зьнята, як няправільна наложанае.

АТРЫМАЛІ ПА ЗАСЛУГАХ

У Добрускім ЦРК некаторыя работнікі злоўжывалі, трымалі сувязь з прыватнікамі. Рабкор паведамляў у сваім допісе аб злачынствах Бляхэра, Анціна і іншых.

Гомельскі акрсуд прыгаварыў **Анціна** да 4-х год пазбаўленьня волі з суровай ізаляцыяй, а Бляхэра да двух год бяз суровай ізаляцыі.

ЗА АБМАН — ДА АДКАЗНАСЬЦІ

Паводле заметкі «Іскжэ-ўдарная», якая была зьмешчана ў № 259 газ. «Зьвязда», зроблена расьсьледваньне. У заметцы пісалася, што Лукашэвіч утойваў пруль, записваў, што яны працабылі.

Пракурор 4 вучастку Менскай акр. паведаміў, што зроблена расьсьледваньне **і прыцягваецца да адказнасьці дзеяцтшэвіч** Уладзімер.

ПРЫЦЯГВАЕЦЦА ДА АДКАЗНАСЬЦІ І БЕЗГАСПАДАРНІКІ ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ

Рабкор паведамляў, што ў сталоўцы ваеннага гарадка (Мазыр) стварыліся ненармальныя зьявішчы. Кухары: **Абрамовіч і Багацько** на работу прыходзілі ў п'яным выглядзе, у выніку чаго ў страву траплялі акуркі, заналкі і розныя адкіды. Загадчык сталоўкі **Пляскач** безгаспадарча адносіўся да работы, адсутнічаў які-б там ні было ўлік прадуктаў.

Мазырскае бюро скаргаў РСІ паведаміла, што Багацько і Пляскач **зьняты з работы,** апошні за растрату засуджаны. Абрамовічу **абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем.** Даны таксама паказаньні аб зьнішчэньні ўсіх дэфэктаў, якія мелі месца ў рабоце сталовай.

ЗЛАЧЫНЦУ ПАКАРАЦЬ

У заметцы «Загатоўшчык» пісалася, што старшыня **Кісьцянеўскага** сельскагаспадарчага т-ва **Гілеб** (Бабруйшчына) набываў сьвіней для адкормачнага пункту, а прыплод ад іх (нарасят) забіваў для сваіх патрэб. Расьсьледваньнем паказаныя факты пацьвердзіліся і Гілеб прыцягваецца да адказнасьці.

— Зьняты з пасады старшыні Бярэзінскага КСУ **Шукан** за продаж каровы. **Прадзедаў К.** прадаў цялушку. Аб гэтых партыйцах за продаж жывёлы пастаўлена пытаньне на парт'ячэйцы.

— Абвешчана вымова старшыні Славенскага сельсавету (Талачынскі раён) **Швэду,** старшыні КСУ і загадчыку крамы за няправільную выдачу хлеба пазбаўленым выбарчых правоў.

— Абвешчана вымова тав. **Дымкоўцу,** як паведамляе Самахвалавіцкі РК КП(б)Б, за спэкуляцыю.

— Зьнята з работы і выключана з саюзу гарбароў **Міхалеўская** (Менск, абуткова фабрыка) за шавіністычныя ўчынкі. Рэшта фактаў, паказаных у заметцы «Шавінізм і антысэмітызм», таксама пацьвердзілася. Прапанавана фабкому ўзмацніць работу на фабрыцы па інтэрнацыянальным выхаваньні.

Будаўніцтва выстаўкі скранулася ўперад

Абстрэл, пад які папала будаўніцтва 1-й усебеларускай выстаўкі, даў свае вынікі. Паведаўшы зараз выстаўку, мы пераканаліся, што павільёны выстаўкі асобных сэктары прамысловасьці, сталі расьці. Прычына і тое, што адзін з павільёнаў гэтага сэктару, які ў сваім першапачатковым выглядзе быў прызнаны нядодным, зараз, пры яго пераканструяваньні, стаў вельмі прыгожым.

Будуецца ўжо і галоўны ўваход выстаўкі ў вытлядзе аркі. Прыступілі, урэшце, да набудовы павільёну вэтэтацыі (галоўны расьлін), які акрамя асноўнай установкі — металёвага шкілету — будзе зроблены са шкла. Асобныя рэшты гэтага шкілету ўжо ўстаноўлены. Набудову гэтага павільёну трэба пачаць, бо пабліжаецца тэрмін для зьмяшчэньня ў ім расьлін для гадоўлі.

Да будаўніцтва раду павільёнаў усё-ж ня прыступлена. Будаўніцтва выстаўкі неабходна фарсаваць, каб мець магчымасьць прыняць экспанаты, якія ўжо частова наступаюць і хутка, пэўна, пачнуць вялізнай масай. Да гэтага часу было наша сакае па

Але, як ажыцьвіць гэтую? — на гэта пытаньне патрэбнага адказу такое становішча, ш

і сацыялістычна-інтэ

МЕНСК

УСЕБЕЛАРУСКАЯ СТУДЭНЦКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ

15-га мая ў Менску склікаецца Усебеларуская студэнцкая канфэрэнцыя. На парадку дня даклад аб чарговых задачах студэнцкіх арганізацый, справаздача ЦБ пралетстуду УсеЦСПС, справаздача ЦБ пралетстуду ЦСПСБ, даклад НКА і інш. Усяго ў рабоце канфэрэнцыі прымуць удзел каля 100 дэлегатаў.

НОВЫ СТАРШЫНЯ ЦБ ПРАЛЕТСТУДУ

Старшынёю ЦБ Пралетстуду пры ЦСПСБ абраны тав. **Эпштэйн,** былы сакратар парткалектыву БДУ.

КАМАНДЫРОЎКА Ў ТРАНСПАРТНУЮ АКАДЭМІЮ

Старшыня Белбюро ЦК саюзу чыгуначнікаў тав. **Ісаеў** камандыраваны на вучобу ў Ленінград ў транспартную акадэмію. Часова выкананьне абавязкаў старшыні Белбюро ўскладзена на тав. **Мандрыка.**

3.000 КАРОЎ ДЛЯ САЎГАСАЎ

У Харкаў выехаў прадстаўнік Белсельтрэсту для заключэньня дагавору з т-вам «Добрабыт» аб пастаўцы для малочных фэрм саўгасаў Беларусі 3.000 прадукцыйных кароў.

САЮЗ ГОРНАРАБОЧЫХ У БЕЛАРУСІ

У Менск прыехаў прадстаўнік ЦК саюзу горнарабочых СССР т. **Жураўлёў** для абгаварэньня пытаньня аб арганізацыі ў БССР саюзу горнарабочых. Саюз будзе аб'ядноўваць рабочых тарфяной, фасфарытнай і іншых галін горнай прамысловасьці.

У сучасны момант такіх рабочых налічваецца 15.000 чалавек. У чэрвені намячаецца скліканьне 1-га Усебеларускага зьезду горнарабочых. У Менску будзе арганізавана ЦП саюзу горнарабочых.

475 ТРАКТАРАЎ НА ПАЛЁХ БЕЛАРУСІІ

Гэтымі днямі для БССР будуць атрыманы—71 трактар «Пуцілавец» і 25 трактараў з Амэрыкі «Інтэрнацыянал». З гэтых трактараў 10 будуць перададзены саўгасам, а рэшта—калгасам.

Дагэтуль к веснавой пасеўнай кампаніі ўжо атрымана каля 178 трактараў. Плян завозу трактараў выкананы поўнасьцю. Усяго ў бягучую веснавую пасеўную кампанію на палёх Беларусі будуць працаваць 475 трактараў.

Гэтымі днямі чакаецца таксама атрыманьне з Амэрыкі першых 14-ці камплектаў абсталяваньня для трактарных майстэрняў.

Хроніка МОПР'у

ПАЛІТЭМІГРАНТЫ НА ПЕРШАМАЙСКІЯ СЬВЯТЫ

Для ўдзелу ў Першамайскіх сьвяткаваньнях на Беларусі прыяжджаюць з Масквы 2 палітэмігранты. **ЦК МОПР'у Беларусі пастанавіў гэтых палітэмігрантаў накіраваць у Воршу і Полацак.**

ДЗЕНЬ «ЧЫРВОНАЙ КВЕТКІ» Ў КАЛГАСАХ І САЎГАСАХ

Менакругком Мопр'у ўжо разаслаў усім вясковым райкомам Мопру Менскай акругі чырвоныя кветкі. У гэтым годзе ўпяршыню **дзень «чырвонай кветкі» пераносіцца непасрэдна на вёску, у калгасы і саўгасы.**

600 АКТЫВІСТЫХ ПРЫМУЦЬ УДЗЕЛ У ДНІ «ЧЫРВОНАЕ КВЕТКІ»

Да ўдзелу ў скарбоначным зборы «чырвонай кветкі» у дні 1-га і 2-га мая мопраўскія актывістыя выяўляюць вялікую зацікаўленасьць. Усе ячэйкі Мопру гор. Менску вылучаюць актывістых для ўдзелу ў скарбоначным зборы. Канфэрэнцыі **дэлегацкіх сходаў,** якія нядаўна адбыліся, **абвясьцілі сябе мабілізаванымі** для ўдзелу ў мопраўскім скарбоначным зборы. У зборы таксама прымуць удзел усе **артыстыя 2-га Беларускага дзяржаўнага тэатру і каманда самакатчыкаў з 30-ці чалавек.** Усяго ў скарбоначным зборы прыме ўдзел **больш за 600 чалавек.**

НАРАДА ЖАКТАЎСКІХ ЯЧЭЕК МОПРУ

На 19-га красавіка Менакругком Мопру склікае **нараду актыву жактаўскіх ячэек Мопру.** У парадку дня нарады—даклад аб міжнародным становішчы і ўдзел Мопру ў першамайскіх сьвяткаваньнях.

КАНФЭРЭНЦЫЯ ЮНЫХ ПРЫХІЛЬНІКАЎ МОПРУ

У сувязі з усесаюзнай інтэрнацыянальнай канфэрэнцыяй-экскурсіяй юных прыхільнікаў Мопру, якая адкрываецца 30-га красавіка ў Маскве, Менакругком Мопру, разам з акруговым бюро ЮП, склікаюць на 24 красавіка **пашыраную канфэрэнцыю піянэраў і вучняў (юных прыхільнікаў Мопру).** У парадку дня канфэрэнцыі будзе заслухан даклад аб далейшых задачах інтэрнацыянальнага выхаваньня юных прыхільнікаў Мопр'у і **выборы дэлегатаў на ўсесаюзную канфэрэнцыю — экскурсыю** юных прыхільнікаў Мопр'у.

Менскаму АК Мопру даны 3 месцы.

1 МЛН. РУБЛЁЎ НА ПАБУДОВУ БОЛЬНІЦЫ Ў БАБРУЙСКУ

Прэзыдыум Дзяржпляну прызнаў патрэбным пабудаваць ў Бабруйску акруговую больніцу на 200 ложкаў, з якіх 150 хірургічных, 15 тэрапэўтычных і 13 сухотных. Агульны кошт больніцы—1.000.000 рублёў. Асноўныя работы павінны быць скончаны ў працягу 2-х год.

СКОНЧЫЎСЯ МЕСЯЧНІК РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ

Скончыўся месячнік праверкі рацыяналізацыі, арганізаваны НК РСІ сумесна з ЦСПСБ. У працягу месячніку паступіла шмат каштоўных рацыяналізатарскіх прапаноў ад рабочых. НК РСІ распачаў масавую праверку рэалізацыі вынікаў месячніку.

Перад 1-га мая

Да 1-га мая прызначаны пуск часовай электрастанцыі і пробнае ўстаноўкі на Магілеўскай фабрыцы штучнага валакна.

Бліжэйшымі днямі Беларускае аддзяленьне электратэхнічнага трэсту заключае дагавор на электрычнае абсталяваньне фабрыкі на суму каля 2-х мільёнаў рублёў.

Да першага мая будзе таксама скончана электрыфікацыя новай гарбарні ў Магілеве.

200 тысяч рабочых на сэзонных работах

Паводле папярэдніх даных, у Беларусі на сэзонных работах будзе занята 200 тысяч рабочых.

Праўленьне Белкаапсаюзу зьвярнулася з просьбаю паскорыць выдзяленьне спэцыяльнага кантынгэнту тавараў (махорка, рыба, алей і інш.) для забесьпячэньня сэзонных рабочых.

У Менску зьнішчаюцца сады

ЧАМУ ГАРСАВЕТ ГЭТА ДАЗВАЛЯЕ?

Перад намі стаіць задача пабудовы сацыялістычных гарадоў. Гэтыя гарады павінны мець шмат зелені.

Але што-ж мы назіраем у Менску? Тут пад выглядам неабходнасьці разгортваньня жыльлёвага будаўніцтва саспяваецца зьнішчаюцца. Ужо высечаны сад Мэдсанпрацы. Зараз чарга даходзіць да саду Працасьветы, дзе мяркуецца будаваць дом спэцыялістых. Магчыма, што такі ёс спаткае сады і ў іншых раёнах Менску.

Мы ставім пытаньне, ці сапраўды патрэбна зьнішчаць сады пры разгортваньні будаўніцтва? Нам здаецца, што садоў ня толькі ня трэба зьнішчаць а наадварот — іх трэба ахоўваць. Вось чаму гарсавет паступае зусім няправільна, калі дае загад аб зьнішчэньні садоў на тых пляцох, якія вызначаюцца ў будаўніцтва. Сады патрэбны для працоўнага насельніцтва і асабліва важны для дзяцей. Ужо і зараз дзіцячыя трупы ня маюць у горадзе патрэбных пляцовак, засаджаных дрэвамі, для гульні.

У нас садоў надта мала і зьнішчэньне іх зьяўляецца такім учынкам, які не заслугоўвае рашучага пратэсту. Трэба РСІ і прафсаюзам заявіць пратэст супроць няправільнай дзейнасьці гарсавету, які дазваляе высякаць сады на тых вучастках, што вызначаюцца пад будаўніцтва.

ПАНКЕВІЧ.

Арганізуецца 45 сьвінаводных саўгасаў

Згодна пастановы калегіі Наркамзэму БССР, Усесаюзнаму трэсту «Сьвінавод» будзе перадана ў першую чаргу 45 саўгасаў з агульнай плошчаю 31.000 гэкт. У гэтых саўгасах будзе впаходзіцца 18.000 матак. Для разьмяшчэньня іх намячаецца пабудова 72-х сьвінарнікаў і 175 будынкаў для адкорму сьвіней.

У мэтах барацьбы з эпізоотыямі ў кожным саўгасе будуць пабудаваны ізалятары.

Намечана пабудова 50 кухань з аўтаматычнымі запальнікамі і мэханізацыяй палачы кормы, што зьменшыць затрату людзкой працы і дасьць магчымасьць лепш абслугоўваць жывёлу.

Апрача таго, праектуецца пабудова ў сьвінаводных саўгасах Беларусі 61 дому для абслугоўваньня пэрсаналу.

Для выкананьня ўсёй гэтай праграмы работ патрабуецца 5.500.000 рублёў. У зьвязку з рэарганізацыяй саўгасаў у прамыслова-сьвінаводныя гаспадаркі Белсельтрэст зьяняў у такіх саўгасах плян веснавой сяўбы. Плошча пад бульбу і кораньплоды, патрэбных для корму, павялічваецца ў гэтых саўгасах на 3-4 тысячы гэктараў. У паасобных саўгасах плошча пад гэтыя культуры павялічваецца ў два разы.

Насеньнем саўгасы забясьпечаны. Плян веснавой сяўбы ў сьвінаводных саўгасах прапрацаваны на нарадзе кіраўнікоў саўгасаў пры Белсельтрэсьце.

Сёньня ў Менск прыяжджае чарга праўленьня трэсту «Сьвінавод» для абмеркаваньня раду пытаньняў, зьвязаных з прыёмкай саўгасаў, разгортваньнем будаўніцтва і ўкамплектаваньнем сьвінарнікаў. Уся работа па перадачы саўгасаў трэсту «Сьвінавод» павінна быць скончана да 1-га мая.

М. К.

Больш увагі рабоча-сялянскай міліцыі

Аб рабоце міліцыі вельмі мала пішуць і часта нават не даацэньваюць ролі яе ў сацыялістычным будаўніцтве.

А між тым, да міліцыі як органу аховы парадку і бязпасьнасьці пралетарскай дзяржавы, патрабуецца вялікая пільнасьць, вытрымласьць, дысцыпліна, веданьне спас прафэсіянальнае справы, а галоўнае выразнае, клясава вытрыманае лініі ў рабоце.

Дзеля таго, каб выканаць гэтыя ўмовы, патрабуецца здавальняючы з пункту погляду клясавага падбору, склад работнікаў, выстарчальная забясьпечанасьць, прафэсіянальная падрыхтоўка міліцэйскіх работнікаў.

Як-жа працуе і жыве міліцыя БССР? Возьмем сацыяльны склад міліцыі. Тут мы маем рабочых 15 проц., сялян 72 проц., служачых 11,4 проц. Такім чынам, пераважны процант работнікаў міліцыі складае сялянска-бяднацка-серадняцкі элемэнт, рабочая прослойка невялікая.

Дырэктывы партыйных органаў аб арабачэньні асабовага складу міліцыі ня выконваецца. Партыйны склад міліцыі—членаў КП(б)Б—10,9 проц., камсамольцаў—6,1 проц.

Шматскладаныя абавязкі, якія ўскладаюцца на міліцыю, патрабуюць ад міліцэйскіх работнікаў большага культурнага ўзроўню.

Сёлета ўпяршыню школьныя заняткі з міліцыянэрамі праводзяцца сыстэматычна пад кіраўніцтвам адміністрацыі і пры ўдзеле мясцовых прафарганізацый. Пры кожным міліцэйскім аб'яднаньні адкрыта школа. Зробленая нядаўна праверка ведаў міліцэйскіх работнікаў дала здавальняючыя вынікі.

Апрача школ пры міліцэйскіх аб'яднаньнях працуюць розныя роду гурткі. Уведзена штодзённая палітгадзіна.

У мэтах узмацненьня ваеннай падрыхтоўкі міліцыі праводзяцца рэгулярныя стрэльбы заняткі з выхадам у поле, дзе вырашаюцца тактычныя задачы.

Абсьледваньне паказала, што ў паасобных мясцох назіраюцца выпадкі парушэньня міліцэйскімі работнікамі дысцыпліны—уход з пастоў, спазьненьне на работу, п'янства і г. д. Для ўзьмацненьня дысцыпліны ў міліцыі ЦВК і СНК БССР прынялі пастанову аб ваенізацыі міліцыі. Першыя дні ўвядзеньня новага палажэньня ўжо далі зьмяншэньне выпадкаў парушэньня дысцыпліны.

Адмоўным фактам у рабоце міліцыі зьяўляецца вялікая перагрузка ея работай. Па Менску, напрыклад, на 1 міліцыянэра прыпадае ў год 86 допытаў, 600 пратаколаў, на 4.000 руб. спагнаньняў і г. д. Часта міліцыю загружаюць зусім непатрэбнай работай—спагнаньнем паводле пастаноў судоў—5-10 кан. судовых выдаткаў.

У аснову сваёй работы міліцыя павінна паставіць задачу найбольш цеснай сувязі з савецкай грамадзянскаю шляхам шырокага ўцягненьня яе ў непасрэдную работу міліцыі. Некаторыя посьпехі мае Менская міліцыя, якая працуе ў поўным кантакце з адміністрацыйна-прававой сэкцыяй гарсавету. Да ўсіх аддзяленьняў прымацаваны члены сэкцыі. У рабоце міліцыі прымаюць удзел і рабочыя заводу «Камунар». Трэба адначыць, што прафэсыянальная арганізацыі ня робяць належнага падтрыманьня міліцыі ў паладжваньні больш цеснай сувязі з прадпрыемствамі.

М. К.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы (партбіпэт). У 18 гадз. нарада прапагандыстых адзінай партшколы і ленінскіх груп Фрунзаўскага раёну. Яўка абавязкова для прапагандыстых.

Сход т-ва знанамістых і аграрнікаў-марысьмістых. У 19 гадз. у ленінскім габінэце камвузу абдудзецца агульны адкрыты сход т-ва. Парадак дня: 1. Даклад т. Пікус.—Вынікі дыскусіі аб трох падручніках па с.-г. эканоміцы і 2. Арганізацыйныя пытаньні. Запраш. НДІ, працаўнікі Наркамзему, Дзяржпляну, нав. працаўнікі эканамістыя БАН і ВДУ.

Клюб саўгандальслужачых. Пры клюбе абсталявана фота-лябараторыя, дзе адбываюцца практычныя заняткі па фота-здымках. Запіс у гурток у канцылярыі клюбу ад 18—22 гадз.

Клюб дрэваапрацоўшчыкаў (Савецкая, 125). Агульны сход групкому адзіночак. Пач. у 19 гадз.

Дом Асьветы. У 20 гадз. адкрыты сход парткалектыву КП(б)Б працасьветы. Даклад аб выніках пленуму ЦК КП(б)Б. Запраш. менскія асьветнікі.

— У 19 гадз. партыйцы ячэйкі працасьветы павінны зьявіцца ў БАН для ўдзелу ў чыстцы члена ячэйкі **Бененсона.**

БДУ (актавая заля). Адкрыты партыйна-камсамольскі сход пэдфаку. Парадак дня: 1. Чарговыя задачы па калектывізацыі і 2. Выбары дэлегатаў на райпартканфэрэнцыю. Запраш. студэнцтва.

ЗАЎТРА

МенАК КП(б)Б (заля пасяджэньняў). У 18 гадз. Фруня. РК КП(б)Б склікае нараду сакратароў ячэек Асоавіяхіму, ваенорганаў парт'ячэек і ваенорганаў ЛКСМБ.

Пэдгабінэт. У 19 гадз.—сэкцыя пэдтэхнічнай асьветы.—Сувязь грамадазнаўства з вытворчасьцю, як адна з умоў політэхнізму школы. Даклад т. Аляксандрава. Запраш. грамадазнаўцы.

Дом асьветы. У 19 гадз. адкрыты сход камсамольскай школьнай ячэйкі. Яўка камсамольцаў абавязкова.

Нарада аб вячэрнім камвузе. У 19 гадз. раніцы культпроп Менакругкома КП(б)Б склікае нараду па пытаньні аб вячэрнім камвузе, на якую запрашаюцца т. т.: Аўчыньнікаў, Модэль, Любецкі, Саевіч, Лур'е, Пятушкоў, Левіна, Эрэнбург, Гурэвіч, Златкін, Калесьнікаў, Дудко—ДЧА, сакратар парткалектыву ДПУ, Скакальскі, загадчык чырвонармейскім вузам, Мятліцкі, Шавель, Шаламаў, Каган, Ярмакоў, Клімковіч, Наменак—радыё-цэнтр. Яўка абавязкова.

17-га красавіка, у 19 гадз. у ДК КАМАСЬВЕТЫ адбудзецца даклад **т. Сянкевіча для парт. і камс. актыву аб міжнародным становішчы. Пасьля даладу—мастацкая частка. Білеты па РК КП(б)Б і ЛКСМБ.**

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Т-ва „ПРЫХІЛЬНІК ДЗЯЦЕЙ" (Савецкая, 40)
У пятніцу, 18 красавіка, а 7 гадз. увечары
адбудзецца
пашыранае пасяджэньне праўленьня
сумесна з прадстаўнікамі бюро ячэек і прымацаванымі дэлегаткамі.
Прысутнасьць прадстаўнікоў бюро ячэек і прымацаваных дэлегатак АБАВЯЗКОВА.

17-га красавіка а 7-й гадзіне ўвечары ў залі пасяджэньняў ЦСПСБ адбудзецца

нарада старшынь камісій па аглядзе грамадзкага харчаваньня

разам з старшынямі фабзаўкомаў,

на якой будуць заслуханы справаздачы агляданых камісій і фабзаўкомаў аб ходзе агляду наступных прадпрыемстваў: 1) заводу «Чырвоная Зара», 2) 1-й дзярждрукарні, 3) заводу «Камунар», 4) шчацінная фабрыкі і 5) МК № 1 чыгуначнікаў.

На нараду павінны зьявіцца **старшыні агляданых камісій і фабзаўкомаў наступных прадпрыемстваў:** «Чырвоная Зара», хлебазаводу, дражджавога заводу «Пралетары», цукеркавай фабрыкі «Прагрэс», сьпіртаводачнага заводу, Менскай фабрыкі, Белмясгандлю, быдла-бойні, 1-й дзярждрукарні, шпалернай фабрыкі, друкарні БАН, працкалектыву друкароў, друкарні «Зьвязда», заводу «Камунар», «Энэргія», «Эльводу», палаты мер і вагі, заводу «Балтыка», абуткова фабрыкі, шчацінная фабрыкі, працкалектыву абутнікаў, шавецкай майстэрні Гандальбуду, Універсытэцкага гарадка, кахлянага заводу, Водканалбуду, «Белдартрансу», зав. «Дрэваапрацоўшчык», швэйнай фабрыкі «Світрычнік», футравай фабрыкі, МК №№ 1, 2 і 3, пасажырск. станц. і № 2 таварнай, пажарнае каманды, гуты «Пралетары», «Чырвоны Хэмік», фармазаводу, «Чырвоны Тэкстыльшчык», 1 і 2 рабочкомы гуучнікаў, працкалектыву лямпавікоў і вяровачнікаў.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ ПА АГЛЯДЗЕ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ. ЦСПСБ.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
Мастацкі фільм вытворчасьці Савкіно
ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ
у 6 част.
Зьвыш праграмы кіно-хроніка Савкіно № 16
Пач. дзен. сэанс. 1 гадз., 3 г. 20 м.
Каса з 12 г. дня.
На дзённых сэансы цэны ад 15 к. да 35 к.
2-гі тыдзень пастаянны 2-гі
Новы фільм
МАРЦІН ФАЛЬКХАГЕН
У галоўнай ролі Жэні Портэн.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно хроніка САВКІНО
Дзённыя сэансы: 1 г. 30 м., 3 гадз.
На дзённыя сэансы ўсе білеты № 25 кап.
Вячэрнія сэансы: 7 г., 8 г. 30 м., 10 г. 20 м.
Каса ад 12 гадз. дня.
Каса ад 5 гадз.
КІНО
2 фільмы ў адзін сэанс 2
1. Палітасьвятны фільм
ЗА ВАША ЗДАРОЎЕ у 5 част.
У галоўных ролях: Чысьцякоў і Блюмэнталь-Тамарына.
2. Замежная камэдыя **Цёмны канёк** у 2 частках.
Пач. 1-га сэансу а 7 г. Каса з 5 гадз.
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
паводле тэмы Янры Барбюса апавяданьня
„Здань, якая не варочаецца"
пэлядрама ў 7 частках.
Пач. 1-га сэансу а 2 гадз., 2-га—3 г. 30 м.
Каса адчынена ад 12 гадз.
Нямецкі баявік
2-е ЖЫЦЬЦЁ
драма ў 7 частках.
Пачатак 1-га сэансу а 7 г., 2-га—а 9 г., 3-га—а 10 г. 45 м.
Каса—ад 5 г. 30 м.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сэзон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску
Серада, 16 красавіка
Адкрыты спэктакль
Б. Лаўрэнеў.
РАЗЛОМ
п'еса ў 4-х дзеях.
Рэшта білетаў у касе тэатру і ў рабочай касе. Пачатак а 8 гадз.

К-т Віцебскай Акруговай Страхавой Касы
абвяшчае КОНКУРС
на ўрача-загадчыка
дома адпачынку «Чырвоны Кастрычнік» пры ст. Завольша МБВ чыгункі.
Умовы: аклад утрыманьня 175 р., кватэра, апал і асьвятленьне.
Тэрмін падачы заяў да 20 красавіка г. г.

ТРЕБУЮТСЯ
КАРТОНАЖНЫЯ ПРОВОЛОКО-ШВЕЙНЫЯ МАШИНЫ,
ЖЕЛАТЕЛЬНО С МЕХАНИЧЕ